Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

6 ЛІПЕНЯ 2022 г.
СЕРАДА
№ 130 (29752)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ЗДАРОВЫЯ ЗУБЫ — НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

6

ЧЫМ І ЯК ЗАМЯСЦІЦЬ ІМПАРТ?

КАРАТКА

• **Новы праект у галіне біяфармацэўтыкі анансавалі ў НАН Беларусі, паведаміла член-карэспандэнт, доктар хімічных навук Алена Калінічэнка. Размова ідзе аб зусім новым пакаленні прэпаратаў, высокаэфектыўных пры лячэнні шэрагу анкалагічных захворванняў.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЯРАШЭНКА, кіраўнік адміністрацыі парка «Вялікі камень»:

«Цяпер у «Вялікім камені» зарэгістраваны 90 рэзідэнтаў з 15 краін. Аб'ём заяўленых інвестыцый складае больш як $1,24 млрд, усяго ж з пачатку рэалізацыі праекта ў парк укладзена амаль $800 млн. Сёлета рэзідэнтамі парка сталі ўжо пяць новых кампаній. Тры з іх — з кітайскім капіталам, якія плануюць рэалізацыю інвестыцыйных праектаў па стварэнні інтэграванай платформы электроннай камерцыі, а таксама цэнтра лічбавага прасоўвання беларускіх тавараў на электронных гандлёвых пляцоўках КНР. Яшчэ адна кампанія з Кітая будзе займацца развіццём лічбавых тэхналогій у лагістыцы. Праекты беларускіх кампаній звязаны з выпускам інавацыйнага абсталявання і камплектуючых для модульнага будаўніцтва разумных дамоў, а таксама шматфункцыянальных шумаізаляваных кабін «Аэракапсула» з аўтаматызаванай сістэмай кіравання».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ЗЯМЕЛЬНЫЯ РЭСУРСЫ, ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎЛАСНАСЦЬ, ФІНАНСЫ — ТРЫ КІТЫ ЛЮБОЙ УЛАДЫ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду з кіраўніцтвам Савета Міністраў, дзе былі разгледжаны два праекты, па якіх пры прыняцці рашэнняў узніклі пытанні. Адзін з іх — указ «Аб распараджэнні маёмасцю», другі — законапраект «Аб дадатковых мерах у сацыяльна-працоўнай сферы».

Фота БелТА.

У нарадзе ўзялі ўдзел прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка, Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля Качанава, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Андрэйчанка, а таксама віцэ-прэм'еры, прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта, міністэрстваў і ведамстваў, губернатары абласцей.

СТАР. 2

Лічбавы свет

ВАКЦЫНАЦЫЯ, МЫТНАЯ ПОШЛІНА І ДАВЕДКА АБ ПРАВАПАРУШЭННЯХ

На Адзіным партале электронных паслуг запрацавалі новыя электронныя сэрвісы

Даведацца, хто, калі і чым вакцынаваўся ад каранавіруса, праверыць, якія правапарушэнні мае чалавек, прадставіць мытным органам электронны сертыфікат выплаты пошлін, падаткаў... Усё гэта з 1 ліпеня можна зрабіць, заказаўшы новыя электронныя паслугі, якія з'явіліся на Адзіным партале электронных паслуг (АПЭП) https://platform.gov.by. Хто і пра што зможа тут даведацца, расказалі ў Нацыянальным цэнтры электронных паслуг.

Ад віруса прышчэпленыя

Доследна-прамысловую эксплуатацыю Адзіная аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма ўліку асоб, вакцынаваных ад COVID-19, прайшла яшчэ ў чэрвені, а з 1 ліпеня яна запрацавала цалкам.

Стварэнне сістэмы прадугледжвалася пастановай Саўміна для аказання ў Беларусі паслуг фізічным асобам, якія перамяшчаюцца па тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза з выкарыстаннем мабільнага дадатку «Падарожнічаю без COVID-19». Беларусы і іншаземныя асобы, якія зрабілі ў Беларусі прышчэпку ад каранавіруснай інфекцыі, могуць загрузіць свае даныя аб вакцынацыі з сістэмы ў згаданы дадатак, расказала **Святлана КАРАНЕВІЧ, начальнік аддзела электроннай камерцыі Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг:**

— Сістэма ўліку вакцынаваных асоб складаецца з інфармацыйнай сістэмы для стварэння і вядзення цэнтралізаванай электроннай базы даных па ўліку праведзеных вакцынацый супраць COVID-19, а таксама выдадзеных сертыфікатаў аб гэтым. Наш Цэнтр — уласнік і аператар сістэмы, а Міністэрства аховы здароўя — уладальнік.

У сістэму ўліку ўносяцца асабістыя звесткі пра вакцынаванага: прозвішча, імя, імя па бацьку, дата нараджэння, пашпартныя даныя, грамадзянства, нумар мабільнага тэлефона. Тут жа змяшчаецца і інфармацыя пра першую дозу вакцыны ад каранавіруснай інфекцыі: дата ўвядзення дозы, найменне прэпарату, краіна-вытворца, нумар партыі вакцыны. Уводзяцца таксама звесткі пра медработніка, які ўвёў медпрэпарат: прозвішча, імя, імя па бацьку. Такая ж інфармацыя дадаецца ў сістэму пасля ўвядзення бустарнай дозы вакцыны супраць COVID-19.

СТАР. 3

Вандроўка патрыёта

ГОРАД БЕЛЫХ НАЧЭЙ

Падарожжа ў сталіцу гандбола і хрысціянскіх традыцый

Піцер тут не пры чым, мы працягваем падарожнічаць па Магілёўшчыне. Нагадаю, наша мэта непрадузята ацаніць, наколькі камфортна і пазнавальна можна правесці час у маленькіх населеных пунктах пры мінімальных выдатках і адсутнасці асабістага транспарту. Вядома, што з фінансамі і асабістым сродкам перамяшчэння ўбачыць можна было б непараўнальна больш. На жаль, з-за невялікага пасажырапатоку транспарт унутры раёна курсіруе не вельмі актыўна. Але нават ад аднаго райцэнтра ўражанняў шмат. Так што наперад, у дарогу!

СТАР. 4



Тут пачыналіся Бялынічы.

«ЗЯМЕЛЬНЫЯ РЭСУРСЫ, ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎЛАСНАСЦЬ, ФІНАНСЫ — ТРЫ КІТЫ ЛЮБОЙ УЛАДЫ»

Пераразмеркаванне паўнамоцтваў

Гаворачы аб указе «Аб распараджэнні маёмасцю», кіраўнік дзяржавы нагадаў, што летась было дамоўлена сканцэнтраваць у адным нарматыўным прававым акце ўсе найважнейшыя палажэнні ў дадзенай сферы з абсалютна празрыстай схемай іх рэалізацыі. «Так, у Беларусі нам удалося пазбегнуць, як той казаў, «ашалелай», агульнай, прыватызацыі, як яе раней называлі, шокавай прыватызацыі, — падкрэсліў беларускі лідар. — У краіне ўстойліва працуюць прадпрыемствы, якія даўно існуюць, ствараюцца новыя вытворчасці, у тым ліку на дзяржаўных прамысловых пляцоўках. Аднак эфектыўнасць выкарыстання дзяржмаёмасці неабходна павышаць. Гэта датычыцца і прыватнай вытворчасці».

Урадам падрыхтаваны комплексны праект, які рэгламентуе, як належыць распараджацца не толькі цалкам дзяржаўнай маёмасцю, але і маёмасцю гаспадарчых таварыстваў з доляй дзяржавы. Прэзідэнт заўважыў, што асноўныя змяненні звязаныя з пераразмеркаваннем паўнамоцтваў паміж органамі дзяржаўнай улады. «Гэта правільна, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Прашу яшчэ раз заўважыць, як я адзначаў раней: паўнамоцтвы размяркоўваюцца з нізу да верху, з верху да нізу. У асноўным — з верху да нізу: ад Прэзідэнта да іншых органаў улады, па вертыкалі. Гэта трэба рабіць».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на два фундаментальныя пытанні. «Гэта зямля сельгаспрызначэння (зямельныя рэсурсы і лясныя ўгоддзі), а таксама дзяржаўная ўласнасць, — паведаміў беларускі лідар. — Што датычыцца ўласнасці, Прэзідэнт, як бы ні хацеў, але не можа гэтыя паўнамоцтвы поўнасцю перадаць па вертыкалі ўніз. Не павінна так быць. Патрэбен кантроль. Аднак і тое, і другое пытанне ў пэўнай ступені перадаваць па вертыкалі ўніз трэба».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што нядаўна былі прыняты рашэнні па зямельных рэсурсах, участках. «Мы прынялі рашэнні па асобных пытаннях перадачы паўнамоцтвы старшыням райвыканкамаў, — удакладніў ён. — І правільна. Чаму Прэзідэнт павінен вырашаць сітуацыю, калі нехта будаваўся і паўметра вылез агароджай на чужую тэрыторыю? І Прэзідэнт павінен гэта або адымаць, або агароджу пераносіць? На месцы людзі вырашаць. Аднак ёсць пытанні выдзялення земляў сельгаспрызначэння, лясных масіваў пад забудову або яшчэ пад іншае — гэта застаецца за Прэзідэнтам. Няма неабходнасці сёння аддаваць гэтыя пытанні нават на ўзровень губернатараў». Гэты вопыт, па словах кіраўніка дзяржавы, ужо быў.

— Зямельныя рэсурсы, дзяржаўная ўласнасць, фінансы — тры кіты любой улады, — лічыць беларускі лідар. — Яшчэ раз паўтару: мы акуратна, спакойна ў гэтым кірунку рухаемся. Можа быць, мы прыйдзем да таго, што ўвогуле Прэзідэнт не будзе займацца гэтымі пытаннямі. Магчыма, нават урад толькі часткова будзе займацца імі.

Аднак большасць рашэнняў з гэтага часу, па словах Аляксандра Лукашэнкі, будзе прымацца на месцах. «Але хацелася б пачуць, да чаго прывядуць дадзеныя прапановы ўрада? — канкрэтызаваў кіраўнік дзяржавы. — Ці не страціць дзяржава кантроль за продажам найбольш прывабных актываў? Ці не створым мы пралазы для карупцыі і спекуляцый? Вопыт суседніх краін нас папярэджвае аб гэтым».

Акрамя таго, Прэзідэнт папрасіў далажыць аб прапановах па праекце экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі і Мінскага гарвыканкама. «Вы добра ведаеце мае патрабаванні: заканадаўства не павінна мяняцца занадта часта, — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка. — І калі мы бачым, што змяненні сапраўды наспелі, то павінны пераканацца, што ўсё ўлічана».

«Дзейнічаем ва ўмовах ваеннага часу»

Другое пытанне, якое разгледзелі на нарадзе з кіраўніком дзяржавы, — законапраект «Аб дадатковых мерах у сацыяльна-працоўнай сферы». Урад прапануе прыняць меры па забеспячэнні стабільнасці ў сацыяльна-працоўнай сферы ва ўмовах санкцый. Меры часовыя, да канца 2022 года. «Адразу пытанне: ці трэба нам на паўгода прымаць законапраекты», — сказаў Прэзідэнт.

У згаданым законапраекце, па-першае, каб падтрымаць працоўныя калектывы, прапануецца аказваць мэтавую дзяржаўную падтрымку наймальнікам. «Гэта значыць, ёсць розныя прадпрыемствы. Але адным мы акажам падтрымку, таму што яны дрэнна працуюць, аб'ектыўна ці суб'ектыўна, іншым мы не дапаможам. Але тады ўзнікае пытанне, навошта працаваць? Навошта мне ўпірацца? У мяне ўсё добра, бо працуе калектыў, а там правалілі з-за суб'ектыўных прычын — ім адразу з бюджэту грошы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па-другое, дадзеным законапраектам пашыраюцца магчымасці наймальнікаў па арганізацыі працы. Гэта павінна забяспечыць стабільную работу прадпрыемстваў і стварыць дадатковы рэсурс, каб больш эфектыўна задзейнічаць работнікаў, не дапусціць падзення іх даходаў.

«Хто перашкаджае ў цяперашніх умовах эфектыўна задзейнічаць работнікаў і зрабіць так, каб прыбыткі не падалі, а раслі. Дык заўсёды ж была такая мэта перад кіраўніком, каб даходы не падалі, а раслі», — заўважыў Прэзідэнт. Віцэ-прэм'ер Юрый Назараў растлумачыў, што менавіта маецца на ўвазе. У Працоўным кодэксе ёсць пэўныя абмежаванні па працягласці звышурочных работ, колькасці выхадных дзён, якія можна выкарыстоўваць, па пераводзе работніка па рашэнні наймальніка на іншую работу.

«Калі толькі гэта, лічыце, што прынята. Лепш акуратна дамовіўшыся, пагаварыўшы, калі гэта трэба, часова ці пастаянна, навучыць, перавучыць ці не вучыць і перавесці работніка на іншую работу. Усякае бывае. І калі ніхто не разумее, а павінны разумець, што мы дзейнічаем (я пра гэта казаў на ўрачыстым сходзе) ва ўмовах ваеннага часу. Калі людзі гэтага не разумеюць, дык што, гарачую вайну развязаць? Тады ж ніхто не пытаецца, куды каго пераводзіць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Па-трэцяе, у законапраекце ўстанаўліваюцца дадатковыя меры сацыяльнай абароны сем'яў, якія трапілі ў складаную фінансавую сітуацыю. На гэта Прэзідэнт заўважыў, што лепш за ўсё сем'і відаць на месцах. У Мінску іх бачаць кіраўнікі адміністрацый і старшыні Мінгарвыканкама, на вёсцы — старшыні сельскіх Саветаў, старшыні райвыканкамаў.

«І калі гаворым аб падтрымцы, дык гэта ж грошы. Дык давайце дадзім ім грошы і проста іх абавяжам, каб яны дапамагалі гэтым сем'ям. Калі вы думаеце, што Лукашэнка, Галоўчанка ці Качанава лепш бачаць з Мінска, каму дапамагчы, вы памыляецеся. Мы проста завяжам па руках і нагах мясцовыя ўлады ў сувязі з аказаннем гэтай падтрымкі... Я за тое, каб падтрымаць тых, каму патрэбная падтрымка. А падтрымаць могуць толькі тыя, хто непасрэдна з гэтымі сем'ямі. Мы толькі можам канцэптуальна ўказаць і паставіць на кантроль, як на месцы губернатар, старшыня райвыканкама і сельскага Савета аказвае гэтую падтрымку сем'ям», — заявіў ён.

Прэзідэнт пацікавіўся, ці не пагаршае закон становішча працоўных? Якія выдаткі лягуць на бюджэт і які эфект атрымаецца ад такога страхавання наймальнікаў? Таксама ён запытаў, ці не прывядуць прапанаваныя новаўвядзенні да таго, што прадпрыемствам будзе больш выгадна атрымаць дзяржпадтрымку, чым варушыцца самім? І галоўнае, па словах кіраўніка дзяржавы, калі меры часовыя, то ці трэба замацоўваць іх у законе?

«Долары на хлеб не намажаш»

Абмяркоўвалася падчас нарады і ўборачная кампанія. «Кожны дзень свет палохаюць голадам да восені і зімы — небывалым з часоў Вялікай Айчыннай вайны. Дыму без агню не бывае, нагнятаецца сітуацыя з пандэміяй, яшчэ з нечым. Голаду быць, і не толькі таму, што не вывезлі ўкраінскае збожжа... Вы бачыце бездапаможнасць, з якой цэлая ААН спрабуе прадухіліць непазбежны крызіс. 50 краін свету крытычна залежаць ад гэтага харчавання. Дык гэта яшчэ кветачкі», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Ён дадаў, што шалёны махавік санкцый у дачыненні да мінеральных угнаенняў, нафтапрадуктаў, лагістыкі перавозак (фрахт, страхоўка) пагражае сарваць і наступныя аграсезоны і проста паваліць рынкі харчавання.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, сёлета яшчэ хлеб будзе: год добры, у Расіі ўраджай, ва Украіне нешта збяруць. «І ў нас, калі мы расхлябана сябе паводзіць не будзем, атрымаем хлябоў столькі, колькі нам трэба для людзей і жывёл. Мы вывозіць пшаніцу і іншыя культуры не будзем, хоць можам. Акрамя рапсу, лёну, тэхнічных культур, бульбы, якой у нас хапае. Трэба гэта ўсё прапусціць праз жывёлагадоўлю, атрымаць мяса і малако», — сказаў ён

Прэзідэнт адзначыў, што цэны на прадукты харчавання ў цэлым будуць расці. Рост цэн на збожжавыя пацягне імгненны рост цэн на іншыя віды харчавання, прадукты жывёлагадоўлі. Цэны ўжо паблі ўсе гістарычныя рэкорды. Ён прывёў як прыклад пшаніцу, якая толькі за апошнія паўгода падаражэла на 60 працэнтаў. «Як аказалася, долары на хлеб не намажаш», — заўважыў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў пра папярэдні скачок цэн на пшаніцу ў 2008 годзе, які скончыўся сумна вядомай «арабскай вясной». «Калі голад і не хапае ежы, пачынаюцца войны. Збожжа стала вялікай палітыкай і, па сутнасці, зброяй. Таму я вам кажу, калі будзе працаваць эканоміка, будзе што паесці і ў што апрануць людзей, гэта гарантыя таго, што мы вытрымаем. А калі ўрад не праваліць іншыя сектары эканомікі і прадпрыемствы, то ніякія санкцыі нам не страшныя», — канстатаваў ён.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз нагадаў, што сітуацыя на харчовым рынку — шанц добра зарабіць. Ён акцэнтаваў увагу на тым, што сёлетняя ўборачная кампанія павінна прайсці на найвышэйшым узроўні арганізацыі і дысцыпліны. Пры гэтым (размова нядаўна была ў Оршы) недапушчальна страціць тэмпы нарыхтоўкі кармоў як трывалай базы жывёлагадоўлі.

Прэзідэнт запатрабаваў ад Генеральнай пракуратуры, Камітэта дзяржаўнага кантролю і Адміністрацыі Прэзідэнта неадкладна дакладваць, як ідуць справы, і не толькі ў лічбах. «Я вас папярэдзіў, што калі на нейкім прадпрыемстве высокі падзёж, ясна, што гэта кармленне і ўтрыманне. Калі яны не могуць захаваць цяля ці парася, — неадкладна перадаць маладняк тым, хто можа яго ўтрымліваць. Праверце па гэтым крытэрыі. Больш на гэтую тэму я размаўляць не буду і ўжо прад'яўлю патрабаванні да Шведа (генеральнага пракурора. — **«Зв.»**) і Герасімава (старшыні Камітэта дзяржкантролю. — **«Зв.»**). Пра ўрад я ўжо не кажу, гэта іх сфера дзейнасці, яны павінны кантраляваць і накіроўваць работу мясцовых органаў улады», — заявіў ён.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што якасць уборкі збожжавых, рапсу, кукурузы павінна быць узорнай! Вырашаны абсалютна ўсе пытанні, аб якіх прасілі аграрыі: паліва, тэхніка, угнаенні. «Пачынайце варушыцца — я пра губернатараў. За якасцю ўборкі — жалезабетонны кантроль ад Мінсельгасхарча і іншых кантралёраў», — падкрэсліў ён.

Па словах кіраўніка дзяржавы, часам страшна глядзець на поле пасля ўборкі. Салому пакрышылі, растрэслі, і праз два тыдні пасля ўборкі поле зялёнае, збольшага ад пустазелля, але яшчэ ў большай ступені ад таго, што велізарную колькасць збожжа страцілі. І сеяць не трэба, усё ўзышло. Кіраўнік дзяржавы папярэдзіў, што страта збожжа на палях будзе расцэньвацца, прынамсі, як эканамічная дыверсія, найбольшае — як злачынства. Ён акцэнтаваў увагу, што кадры на месцах павінны быць мабілізаваны на сто працэнтаў. Ніякай расхлябанасці і ашуканства. Поўная зладжанасць і парадак па законах ваеннага часу.

«Ідзе гібрыдная вайна. СМІ, дыпламатыя, фінансы, эканоміка — усё задзейнічана. І правакацыі ваенныя пачаліся. Мабілізуйцеся, будзе ў засеках нешта — любую вайну вытрымаем. Пераканаўча вас прашу: з наступнага тыдня ўсе павінны распачаць уборку ўраджаю», — сказаў Прэзідэнт.

Вераніка КАНЮТА,
Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

Старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Дзмітрый МАТУСЕВІЧ, які падчас нарады дакладваў аб праекце ўказа «Аб распараджэнні маёмасцю», расказаў аб некаторых новаўвядзеннях:

— Зрушыліся акцэнты ў бок работы з мясцовымі органамі ўлады. Кіраўнік дзяржавы даручыў дапрацаваць і адобрыў падыходы, згодна з якімі работа з Дзяржкаммаёмасцю будзе праходзіць або па прамым рашэнні мясцовых органаў улады, або па ўзгодненні з імі. Што датычыцца прамых рашэнняў, прыклад продажу за адну базавую велічыню будзе дапускацца мясцовымі органамі ўлады па тых умовах, якія яны будуць вызначаць, зыходзячы з канкрэтнай сітуацыі ў рэгіёне і ў мэтах рэгіянальнага развіцця.

Што датычыцца пытання выкупу арэнднай маёмасці, якая на працягу трох гадоў добрасумленна арандуецца, то прапанавана дапрацаваць праект у частцы яго ўзгаднення з мясцовымі органамі ўлады. «Вядома, самая вялікая зацікаўленасць у горадзе Мінску і абласных цэнтрах, — адзначыў Дзмітрый Матусевіч. — Аднак моманты па прыярытэтнасці выкупу мы з указа выключаем».

Праект указа даручана дапрацаваць да канца месяца, разгледзець яго падчас экспертнага савету пры Савеце Рэспублікі.

Падчас нарады Прэзідэнта таксама абмяркоўваліся і дадатковыя меры ў сацыяльна-працоўнай сферы. У бліжэйшай перспектыве супрацоўнікі прадпрыемстваў, якія апынуліся ў рэжыме вымушанай няпоўнай занятасці або былі звольнены, могуць разлічваць на дзяржаўную падтрымку.

— У сітуацыі, калі на некаторых прамысловых прадпрыемствах ёсць факты няпоўнай занятасці супрацоўнікаў, прастою, узнікае неабходнасць максімальна падтрымаць чалавека, у якога ў гэтай сітуацыі, бяспрэчна, упадуць даходы, узровень заработнай платы, — паведаміла **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ.** — Для гэтага быў прапанаваны механізм адраснай сацыяльнай дапамогі. Яна аказваецца канкрэтнаму чалавеку, але закранае ў цэлым і сям'ю, бо разлічваецца зыходзячы з сярэднедушавога даходу сям'і. На разгляд кіраўніку дзяржавы быў унесены праект адпаведнага закона, аднак па выніках дыскусіі прынята рашэнне зафіксаваць дадатковыя меры ў праекце ўказа Прэзідэнта — падрыхтоўка такога дакумента займае менш часу.

У прыватнасці, вырашана адкарэктаваць дзеючы механізм адраснай сацыяльнай дапамогі ў частцы прадстаўлення дакументаў, якія пацвярджаюць даход. «Калі цяпер трэба прадставіць дакументы за 12 месяцаў, каб дзяржава аказала падтрымку, то ў новым указе гэты перыяд будзе скарочаны да трох месяцаў для тых супрацоўнікаў, якія апынуліся ў рэжыме вымушанай няпоўнай занятасці або былі звольненыя, — растлумачыла міністр. — Гэтым мы адрасна, кропкава дапамагаем чалавеку і яго сям'і вырашыць праблему ў сувязі са зніжэннем даходу».

Прымаць рашэнне аб аказанні падтрымкі будуць па-ранейшаму органы выканаўчай улады на месцах. «Менавіта там, дзе жыве чалавек, ведаюць праблему сям'і і чалавека, — падкрэсліла Ірына Касцевіч. — Чалавеку трэба напісаць заяву, падаць дакументы ў рамках дзяржаўнай паслугі «адно акно», і адпаведныя органы будуць прымаць рашэнне».

Таксама новаўвядзенні закрануць працоўныя адносіны супрацоўнікаў і наймальнікаў. Па словах Ірыны Касцевіч, галоўнае — забяспечыць баланс правоў і абавязкаў наймальніка і грамадзяніна.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ВАКЦЫНАЦЫЯ, МЫТНАЯ ПОШЛІНА І ДАВЕДКА АБ ПРАВАПАРУШЭННЯХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Любы грамадзянін можа ўбачыць звесткі пра свае вакцынацыі і сертыфікаты і пры неабходнасці прад'явіць іх для кантролю, скарыстаўшыся адзіным парталам ці мабільным дадаткам. А на сайце Цэнтра можна азнаёміцца з рэгламентам інфармацыйнага ўзаемадзеяння з сістэмай уліку, а таксама з тарыфамі на яе выкарыстанне, дадала спецыяліст.

У перспектыве плануецца, што ў сістэму ўліку асоб, вакцынаваных ад каранавіруса, будуць унесены таксама звесткі пра прафілактычныя прышчэпкі і вакцынацыю ад іншых захворванняў.

На тэрыторыі Беларусі прад'яўляць COVID-пашпарты не трэба. Аднак з улікам заканадаўства іншых дзяржаў (дарэчы, у выпадку дзеяння эпідэмічных абмежаванняў такі дакумент патрабаваўся для падарожжаў па Расіі, Арменіі, Азербайджане, Казахстане, Малдове, Узбекістане, Кыргызстане і Таджыкістане) QR-коды са звесткамі пра завершаную вакцынацыю сталі абавязковым патрабаваннем для бяспечных падарожжаў і наведвання грамадскіх месцаў.

Сертыфікат для рэзідэнтаў

Новы від мытнага дакумента — сертыфікат забеспячэння аплаты мытных пошлін, падаткаў — з 1 ліпеня на адзіным партале можна перадаваць пры дапамозе агульнадзяржаўнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы. Дагэтуль праз ААІС у мытныя органы электроннага папярэдняга інфармавання можна было перадаваць толькі электроннае папярэдняе інфармаванне, электронную статыстычную дэкларацыю, электронную транзітную дэкларацыю, пасажырскую мытную дэкларацыю для экспрэс-грузаў, дэкларацыі на тавары па экспрэс-грузах, падзялілася Святлана Караневіч:

— Вынікам паслугі, прызначанай для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў — рэзідэнтаў Беларусі, з'яўляецца электроннае паведамленне. У ім утрымліваецца ўнікальны нумар мытнага дакумента ці адмова мытных органаў краіны ў прысваенні такога нумара або іншае паведамленне, якім пацвярджаецца прыём мытнага дакумента спажыўца электроннай паслугі ў электроннай сістэме мытных органаў.

Каб звярнуцца па дадзеную паслугу, трэба выканаць наступныя дзеянні:

— атрымаць сродкі электроннага лічбавага подпісу ў Дзяржаўнай сістэме кіравання адкрытымі ключамі;

— запоўніць заяву на сайце Цэнтра https://nces.by/service/services_oais/ezayavka-oais/;

— заключыць дагавор на аказанне электронных паслуг;

— прайсці аўтэнтыфікацыю на адзіным партале.

Пасля гэтага паслуга стане даступнай у асабістым кабінеце карыстальніка. Важна, што ў межах паслугі «Прадстаўленне мытным органам электроннай статыстычнай дэкларацыі» тарыфікуюцца паслугі па прадстаўленні мытным органам электроннай імпартнай статыстычнай дэкларацыі, падкрэсліла эксперт Цэнтра.

Адміністрацыйныя «хвасты»: свае і чужыя

Натарыусы, адвакаты і нават простыя грамадзяне цяпер могуць атрымаць звесткі аб правапарушэннях, якія захоўваюцца ў Адзіным дзяржаўным банку даных аб правапарушэннях. Для гэтага на АПЭП (https://platform.gov.by) прадугледжаны дзве новыя паслугі: для фізічных асоб і для адвакатаў і натарыусаў.

Электронная паслуга 3.19.02 «Прадстаўленне фізічным асобам звестак аб правапарушэннях, якія захоўваюцца ў Адзіным дзяржаўным банку даных аб правапарушэннях», даступная для фізічнай асобы ў яе асабістым кабінеце пасля праходжання чалавекам працэдуры строгай аўтэнтыфікацыі (з выкарыстаннем электроннага лічбавага подпісу або ID-карткі) ці нястрогай аўтэнтыфікацыі (з выкарыстаннем толькі лагіна і пароля), абазначыла **Ірына ЯСЮЧЭНЯ, намеснік начальніка аддзела электроннай камерцыі Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг:**

— Гэтая паслуга аказваецца з мэтай падачы фізічнымі асобамі заяў для атрымання выпіскі з Адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях у выглядзе электроннага дакумента ці ў іншай электроннай форме. Звесткі пра правапарушэнні можна атрымаць як у дачыненні да самога сябе, так і даведацца, якія парушэнні мае іншая асоба (у гэтым выпадку чалавек, які фармулюе запыт, павінен мець натарыяльна заверан дакумент, вызначаны законам). Каб засведчыць такі дакумент у натарыуса, асоба, якая жадае атрымаць звесткі пра іншага, павінна заручыцца згодай гэтай асобы на распаўсюджванне яе персанальных даных, то-бок прыйсці да натарыуса разам з ёй.

Калі чалавек прайшоў строгую аўтэнтыфікацыю на адзіным партале, то ён можа заказаць выпіску ў пісьмовай форме ці ў выглядзе электроннага дакумента. Атрымаць звесткі ў электронным выглядзе пасля такой аўтэнтыфікацыі можна як пра самога сябе (напрыклад, калі чалавеку трэба ўпэўніцца, што ў яго няма адміністрацыйных «хвастоў», каб спакойна выехаць за мяжу), так і пра іншую асобу. У апошнім выпадку трэба прыкласці ў электронным варыянце натарыяльна завераны дакумент з дазволам на гэта.

Калі ж ён захоча атрымаць падобныя звесткі пра іншую асобу (нават калі мае ў электронным варыянце натарыяльна завераны дакумент з дазволам на гэта), яму ўсё роўна найперш прыйдзецца прыйсці ў органы ўнутраных спраў, каб пацвердзіць, што ён заказваў такую выпіску ў дачыненні да іншай асобы і мае права на яе атрыманне (і атрымаць яе ў пісьмовай форме). Толькі пасля гэтага яму дашлюць у асабісты кабінет на партале і электронную выпіску.

— Пры нястрогай аўтэнтыфікацыі на партале чалавек мае права на заказ выпіскі ў дачыненні да самога сябе ці пра іншую асобу толькі ў пісьмовай форме. Для гэтага яму неабходна будзе прыйсці ў органы ўнутраных спраў, каб пацвердзіць, што ён рабіў такі запыт, — акцэнтавала ўвагу спецыяліст.

Электронная паслуга 3.19.03 «Прадстаўленне натарыусам і адвакатам звестак аб правапарушэннях, якія захоўваюцца ў Адзіным дзяржаўным банку даных аб правапарушэннях» аказваецца як без атрымання згоды фізічнай асобы на прадстаўленне яго персанальных даных (калі гэта прадугледжана законам), так і пры ўмове яе атрымання.

— Паслуга даступная для натарыусаў і адвакатаў у асабістым электронным кабінеце на адзіным партале пасля праходжання імі працэдуры строгай аўтэнтыфікацыі (з выкарыстаннем электроннага лічбавага подпісу ці ID-карткі). Яна аказваецца з мэтай фарміравання запыту для атрымання выпіскі з Адзінага дзяржаўнага банку даных аб правапарушэннях у выглядзе электроннага дакумента ці ў іншай электроннай форме. Пры гэтым натарыус або адвакат указвае свае персанальныя даныя: пасаду і статус.

Ірына СІДАРОК.

За прадстаўленне звестак з Адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях бярэцца плата, таму паслугі 3.19.02 і 3.19.03 платныя. Калі выпіску атрымліваюць у тэрмін да 15 дзён з дня падачы заявы на яе атрыманне, каштуе гэта палову базавай велічыні. Калі выпіска даецца ў тэрмін да трох рабочых дзён, то яе цана — адна базавая велічыня (цяпер гэта 32 рублі), без уліку тэрмінаў на дастаўку такіх звестак. Аплаціць паслугу можна праз АРІП, пазначыўшы наступны шлях: АРІП — Электронны ўрад — Асабісты кабінет АПЭП — Паслугі са зборным плацяжом.

Што пачым

ВАЛОШКІ, ЧАРНІЦЫ І СУНІЦЫ

Хутка Віцебск расчыніць свае дзверы насустрач «Славянскаму базару». Да фестывалю рыхтуюцца не толькі арганізатары, але і руплівыя гандляры на мясцовых рынках. Карэспандэнт газеты «Звязда» выправілася на адзін з іх, каб азнаёміцца з прадстаўленым таварам і разведаць, што ў пачатку ліпеня асабліва хадавое.

Брэсцкія клубніцы ўжо зведалі масавы продаж, цана на іх у канцы чэрвеня вагалася ад 4.90 да 8.50 рубля за кілаграм. На змену фермерскім ягадам прыйшлі садовыя, сартоў і калібраў якіх у прадпрымальных гандляроў прадукцыяй сельскагаспадарчай вытворчасці шмат. «Кімберлі», «азія», «віктарыя» — з кожнага самаробнага прылаўка на пакупнікоў з вядзерцаў паглядаюць пунсовыя і цёмна-бардовыя красуні, якія на розныя лады расхвальваюць прадаўцы. Літровае вядзерца буйных, адна да адной клубніц каштуе 10 рублёў. Хтосьці аддае і па 8 — не вытрымліваюць вялікай канкурэнцыі.

З'явіліся на рынку культурнай сталіцы і лясныя суніцы. Той, хто разумее складанасць і цяжкасць іх збору, не таргуючыся, купляе паўлітровік за 10 рублёў. Дарагавата, але ў лясных суніцах, у адрозненне ад садовых, захоўваецца больш вітамінаў. Пад канец дня, калі гандаль ідзе на спад, прадаўцы аддаюць такі слоічак за 4 рублі.

Некалькі дзён таму на мясцовых рынках з'явіліся і чарніцы, якія ў пакупнікоў карыстаюцца найбольшым попытам. Пакуль на першыя ягады ў гэтым сезоне трымаецца высокая цана — 10-12 рублёў за літр. Магчыма, калі сёлета ягад будзе багата, цана спусціцца ніжэй. Калі не — будзе трымацца, як і летась, 10 рублёў за літр. Ахвотна бяруць чарніцы людзі сталага ўзросту — кажуць, што паляпшае зрок.

Стартаваў продаж грыбоў. Тыдзень таму аматары «ціхага паляванне» прывезлі на віцебскі рынак лісічкі. Пакуль яны толькі з'явіліся ў навакольных лясах, але першыя маленькія грыбочкі, як паказвае практыка, самыя смачныя. Хрусткія і яркія — добра падыходзяць для марынавання і проста смажання з маладой бульбай. Літр лісічак каштуе 10 рублёў, некаторыя гандляры аддаюць за 7 і 6. Крыху пазней, калі пачнецца масавы збор гэтага ляснога багацця, цана будзе ніжэйшая.

Ахвотна купляюць кветкі — рамонкі лугавыя і садовыя ад 5 да 10 рублёў за букет, лілеі, куставыя ружы. Пачынаецца сезон блакітна-сініх валошак: пакуль букецік каштуе 5 рублёў. Хутка яны з'явяцца на кожнай цэнтральнай вуліцы горада над Дзвіной, бо ўжо даўно сталі неад'емным сімвалам міжнароднага фестывалю мастацтваў.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Страляніна падчас святкавання Дня незалежнасці ў ЗША: шэсць загінулых, дзясяткі параненых

Не менш чым шэсць чалавек загінула і 24 атрымалі раненні, калі зламыснік распачаў страляніну ў амерыканскім штаце Ілінойс на парадзе ў гонар Дня незалежнасці ЗША, перадалі мясцовыя СМІ. Інцыдэнт адбыўся ў Хайленд-Парку каля Чыкага. Паводле даных The Washington Post, мэр Хайленд-Парка Нэнсі Ротэрынг заявіла, што ўсе мерапрыемствы з нагоды свята адмянілі. Такія меры прымянілі і ў суседніх гарадах. Пазней тэлеканал CNN паведаміў, што падазраваны быў узяты пад варту недалёка ад горада Лэйк-Форэст (штат Ілінойс). Праваахоўныя органы заявілі, што ён быў заўважаны паліцэйскім і паспрабаваў уцячы, але ў выніку непрацяглай пагоні быў затрыманы. Страляніна адбылася і ў Філадэльфіі (штат Пенсільванія), у выніку былі паранены два паліцэйскія, паведаміў тэлеканал NBC. Інцыдэнт адбыўся падчас святочнага феерверку з нагоды Дня незалежнасці ЗША, за якім назіралі дзясяткі тысяч жыхароў. Пасля страляніны людзі ў паніцы ўцякалі з месца здарэння, узнікла цісканіна.

Шольц назваў доўгатэрміновымі цяперашнія эканамічныя праблемы Германіі

Пры гэтым канцлер Германіі параўнаў цяперашнія цяжкасці з сітуацыяй 1960—1970-х гадоў. «Мы маем справу з гістарычным выклікам», — прыводзіць яго словы Bloomberg. Раней Олаф Шольц правёў з прадстаўнікамі Бундэсбанка, работадаўцамі і прафсаюзамі перагаворы па пытанні зніжэння выдаткаў ад інфляцыі для грамадзян краіны. Напярэдадні канцлер папярэдзіваў, што рост цэн можа аказаць «выбуховы» эфект на нямецкае грамадства, паглыбіўшы супярэчнасці паміж рознымі пластамі насельніцтва. Раней у чэрвені нямецкі ўрад актываваў другую фазу свайго трохэтапнага надзвычайнага плана дзеянняў для забеспячэння газам: ён, у прыватнасці, мяркуе, што пастаўшчыкі энергіі могуць перакладваць цяжар росту цэн на спажыўцоў. Прадстаўнікі ўладаў папярэджвалі, што адпаведныя сумы для спажыўцоў могуць вырасці ў два-тры разы.

У пяці рэгіёнах Італіі аб'явілі надзвычайны рэжым з-за рэкорднай засухі

Урад Італіі абвясціў рэжым надзвычайнай сітуацыі ў большасці раёнаў на поўначы краіны, якія церпяць ад засухі, паведаміла Associated Press. У некаторых гарадах, у прыватнасці, у Вероне, з-за засухі нават увялі абмежаванні на выкарыстанне вады. Пры гэтым падкрэсліваецца, што спёка пачынае закрануць раёны Паўднёвай і Цэнтральнай Італіі. Недахоп вады ў паўночнай Італіі пагоршылі незвычайна гарачае надвор'е і малую колькасць ападкаў зімой і вясной. Паводле даных італьянскай асацыяцыі сельгасвытворцаў Coldiretti, засуха пагражае недзе трэці сельскагаспадарчай прадукцыі краіны. По — найдаўжэйшая рака Італіі, якая працякае больш чым на 650 км. Некаторыя яе прытокі цяпер перасохлі. Акрамя таго, па словах фермераў, салёная марская вада прасочваецца ў раку, знішчаючы пасевы.

ГОРАД БЕЛЫХ НАЧЭЙ

Пад аховай Божай Маці

Даўно гэта было, яшчэ ў эпоху мангола-татарскіх нашэсцяў Батыя. Менавіта ад іх ратавалі два манахі з Кіева-Пячэрскай лаўры старадаўнюю візантыйскую ікону Божай Маці. Па вадзе «дайшлі» яны да прыгожага месца на ўзвышшы і заснавалі там манастыр з царквой у гонар прарока Ільі. Памаліліся перад іконай, а ноччу прачнуліся ад незвычайнага ззяння, якое зыходзіла ад абраза. Яно было такім моцным, што ноч падалася ім белай. Па легендзе, мястэчка пасля гэтага так і сталі называць — Бялынічы. І шмат яшчэ цудаў адбылося на гэтай зямлі. Некалькі гадоў таму YouTube абляцеў ролік, як з хрэсным ходам з Магілёва ў Бялынічы даволі доўга ішоў бусел. Ці не цуд гэта? Дарэчы, герб горада — абраз Бялыніцкай Божай Маці, размешчаны па ўсім горадзе. А на цэнтральнай вуліцы чакаюць сустрэчных анёлы. Адзін з іх з'явіўся пазалетась да Дня беларускага пісьменства і знаходзіцца на месцы былога касцёла кармелітаў. А плошча так і называецца — Манастырская.

У летапісах горад упершыню ўпамінаецца ў 1240 годзе, а ў 1634-м яму было даравана Магдэбургскае права. Пра гісторыю лепш даведацца ў тутэйшым мастацкім музеі імя Бялыніцкага-Бірулі. Гэты музей і па сваіх калекцыях, і па памерах мог бы ўпрыгожыць буйны горад. Да Дня беларускага пісьменства яго плошчы пашырылі ўдвая, амаль да 900 «квадратаў».

Пра манастыр кармелітаў нагадвае вялікая фрэска «Узыходжанне на Галгофу» ў цэнтральнай зале музея. Яе абнавіў мсціслаўскі рэстаўратар Юрый Маліноўскі. Макет лесвічнай пляцоўкі манастыра дазваляе ўявіць, як яна выглядала на манастырскай сцяне.

Гісторыя ў асобах

Старадаўнія Бялынічы аднавіла на карцінах вядомая бялыніцкая мастачка Ларыса Журавовіч. На карцінах колішнія ўладальнікі Бялыніч — Леў Сапега, яго сын Казімір, гусар і паэт Дзяніс Давыдаў, які праславіўся пры вызваленні Бялыніч ад французаў.

У сярэдзіне XVIII стагоддзя ў Бялынічах знаходзіўся маёнтак Агінскіх. Ліпавы гай, папулярнае месца адпачынку тутэйшых жыхароў, якраз быў закладзены яго колішнім уладальнікам.

З Бялынічамі звязаны імёны Герояў Савецкага Саюза юнага партызана Леаніда Лорчанкі, камандзіра партызанскіх атрадаў Асмана Касаева, лётчыка Мікалая Кітаева. Кажуць, што калі самалёт апошняга з'яўляўся ў небе, немцы папярэджвалі сваіх аб вялікай ступені небяспечнасці. З раёнам звязаны імёны шасці Герояў Савецкага Саюза. У іх гонар названыя вуліцы горада, а таксама алея ў Ліпавым гаі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пэндзаль Вітольда Каэтанавіча

Сапраўдны скарб музея — 27 арыгінальных работ Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, гэта падарунак Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Мастак маляваў выключна прыроду. Любімымі порамі года ў яго былі ранняя вясна і восень. Лета ён не любіў, казаў, што гэта салат, вельмі шмат розных фарбаў. Бялынічына — малая радзіма славутага мастака. Нарадзіўся ён у вёсцы Крынкі, што знаходзілася непадалёк ад вёскі Цяхцін. Яе, на жаль, на карце раёна ўжо няма, але пра нараджэнне майстра жывапісу там нагадвае памятны знак. Маленькі Вітольд маляваў з пяці гадоў. Маці заахвочвала схільнасці дзіцяці, падарыла яму пэндзаль і фарбы. Яшчэ падчас яго вучобы ў Маскве вядомы мастак Левітан прарочыў юнаку вялікае будучае. Мастак шмат падарожнічаў, бываў у Запаляр'і. Усё жыццё пражыў у Расіі ў Цвярской вобласці на беразе возера Удомля. Там пабудаваў прыгожую двухпавярховую дачу і назваў яе «Чайка». Вонкава яна нагадвала вялікую птушку і нават пафарбаваная была як сапраўдная чайка — у чорны і белы колеры. Нашчадкаў у мастака не засталося. Яго адзіная дачка патанула ў гэтым жа возеры, калі ёй было 47 гадоў. На радзіме быў усяго некалькі разоў. Памёр у 1957 годзе ва ўзросце 85 гадоў, пахаваны ў Маскве на Новадзявочых могілках. З асабістых рэчаў у бялыніцкім музеі захоўваюцца яго пэндзаль і палітра, якія перадала жонка.

Ціхае абаянне старых вуліц

Цікава гуляць па старадаўняй частцы горада, у прыватным сектары, што за царквой у гонар іконы Бялыніцкай Божай Маці. Да рэвалюцыі асноўнае насельніцтва горада складалася з яўрэяў і палякаў. Калі спускаешся да ракі, на вочы трапляюць старыя дамы, якія захавалі прыкметы колішняй эпохі. **Намеснік старшыні раённага Савета дэпутатаў, дырэктар Бялыніцкага «Жылкамгаса» Віктар ІВУЛЕЎ** (вялікі аматар тутэйшай гісторыі) не па чутках ведае пра падземныя хады, на якіх стаіць райсэнтр. Камунальнікі неяк натрапілі на сцены аднаго з іх. Магчыма, у будучым падзямеллі Бялыніч стануць прадметам для даследаванняў.

Віктар Міхайлавіч памятае, як у школьныя гады лазіў па манастырскіх руінах. Будынак быў закінуты, але стаяў пад купалам. Памятае і фрэску, на якую цяпер прыходзяць паглядзець у музей. Яна была зафарбаваная, і дзеці калупалі фарбу, каб зазірнуць, а што пад ёй. Запомнілася будучаму дэпутату статуя да столі, па якой дзеці, уласна, і траплялі, забраўшыся на дах, унутр будынка. Яна была такая высокая, што, каб дацягнуцца да яе калена, 15-гадоваму падлетку трэба было задраць руку.

Хлопцы спускаліся і ў падвалы. Запальвалі факелы і ўяўлялі сябе рыцарамі. Калідоры былі даўжынёй 12-15 метраў, шырынёй — каля сямі. Таўшчыня сцен даходзіла да метра і мела ацяпляльныя адтуліны.

Музей спорту ў гасцініцы

Бялыніцкая гасцініца, дарэчы, яшчэ адна славутасць раёна. Сімпатычны трохпавярховік знаходзіцца на балансе «Жылкамгаса» і па ім адчуваецца, колькі тут любяць гісторыю раёна. У фае, на другім і трэцім паверхах экспазіцыі, адна прысвечана мінуламу горада, а другая — спартыўным дасягненням. Бялынічы былі сапраўднай сталіцай беларускага гандбола. Каманду, якую стварыў тутэйшы трэнер Віталь Кулік, ведалі далёка за межамі краіны. З пачатку дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя жаночая гандбольная каманда «Друць-Белпак» выступала ў вышэйшай лізе нацыянальнага чэмпіянату Рэспублікі Беларусь. На сцяне гасцінічнага фае ёсць фота з надпісам «Каманда Бялыніцкага раёна па гандболе — чэмпіён СССР сярод камандаў ЦС (цэнтральныя саветы) сельскіх ДСТ (добраахвотнае спартыўнае таварыства) «Ураджай». Каманда з Бялыніч адзіная ў рэспубліцы з раённых, якая дабілася такіх высокіх вынікаў.

Наогул Бялыніччына — прыдатная зямля для вырошчвання чэмпіёнаў. Адсюль родам спартыўныя зоркі па дзюдо, самба, футболе, валейболе, лёгкай атлетыцы. Удзельніца трох Алімпійскіх гульняў Валянціна Цыбульская ў 1980-х гадах займалася ў секцыі гандбола ў Куліка, потым захапілася спартыўнай хадой.

Што датычыцца гасцінічных нумароў, мяне мой аднамесны не расчараваў. У наяўнасці ўсё, што трэба, — зручная мэбля, халадзільнік, набор посуду, не кажу ўжо пра тэлевізар, бо навошта ён вандроўніку. Перакусіць смачна і не вельмі дорага — таксама не праблема. Напрыклад, у кавярні «Белыя росы», дзе калісьці былі келлі для манахаў.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

Прыёмная кампанія — 2022

ХТО МОЖА ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ЦТ У РЭЗЕРВОВЫЯ ДНІ?

Здача абітурыентамі цэнтралізаванага тэсціравання выйшла на фінішную прамую. Ім засталося толькі дачакацца вынікаў і забраць свае сертыфікаты. Але да 7 ліпеня яшчэ можна зарэгістравацца на цэнтралізаванае тэсціраванне ў рэзервовыя дні. Праўда, каб быць да яго дапушчанымі, патрабуюцца ўважлівыя прычыны.

Да рэгістрацыі на рэзервовыя дні дапускаюцца абітурыенты, якія былі зарэгістраваныя на цэнтралізаванае тэсціраванне ў перыяд з 2 мая да 1 чэрвеня бягучага года, але не змаглі ўзяць у ім удзел з уважлівай прычыны (гэта можа быць захворванне або іншыя незалежныя ад абітурыента абставіны, пацверджаныя дакументальна).

Адсутнасць у дзень правядзення ЦТ у абітурыента дакумента, які сведчыць яго асобу (у тым ліку знаходжанне дакумента на афармленні візы) не з'яўляецца падставай для перарэгістрацыі і праходжання тэсціравання ў рэзервовы дзень.

Абітурыенты, якія не з'явіліся на цэнтралізаванае тэсціраванне з уважлівай прычыны, могуць скарыстацца рэзервовымі днямі. 12 і 14 ліпеня можна будзе здаць беларускую і рускую мовы, а 12 і 16 ліпеня — грамадазнаўства, матэматыку, біялогію, замежныя мовы, хімію, фізіку, гісторыю Беларусі, геаграфію, сусветную гісторыю навейшага часу.

Перарэгістравацца для ўдзелу ў ЦТ у рэзервовы дзень можна толькі ў шасці пунктах рэгістрацыі: у Беларускім дзяржаўным універсітэце, Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы, Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце імя П. Сухога і Беларуска-Расійскім універсітэце.

Да ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні ў рэзервовыя дні не дапускаюцца абітурыенты, якія жадаюць палепшыць вынікі тэсціравання, і абітурыенты, выдаленыя за парушэнне правілаў праходжання цэнтралізаванага тэсціравання ў асноўны дзень яго правядзення.

Абітурыент, які звяртаецца ў пункт рэгістрацыі, павінен мець пры сабе пашпарт (пасведчанне на права жыхарства, пасведчанне бежанца або даведку, якая выдаецца ў выпадку страты (крадзяжу) дакумента, які сведчыць асобу), пропуск на цэнтралізаванае тэсціраванне, атрыманы раней, і дакумент, які пацвярджае ўважлівую прычыну пропуску ЦТ у асноўны дзень.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Энергетыка

Жыхарам прапануюць аплаціць трэць работ

па мадэрнізацыі электрасеткавай інфраструктуры

У краіне існуе 200 тысяч кіламетраў размеркавальных электрасетак напружаннем 0,4-10 кВ, якія маюць розную ступень зношанасці. У адзін момант выканаць іх мадэрнізацыю немагчыма ні фізічна, ні арганізацыйна — для рэканструкцыі спатрэбіцца каля 11 мільярдаў рублёў, расказаў Андрэй НЯГОДЗЬКА, начальнік упраўлення стратэгічнага развіцця Белэнерга падчас анлайн-канферэнцыі пра мадэрнізацыю электрасеткавай інфраструктуры краіны.

— Асноўная крыніца фінансавання работ па рэканструкцыі электрасетак у раёне індывідуальнай жылой забудовы — уласныя сродкі энергазабяспечвальнай арганізацыі, бюджэтныя сродкі, якія выдаткоўваюцца на рэалізацыю праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе». Пад уласнымі сродкамі маецца на ўвазе амартызацыя, якая штогод налічваецца для аднаўлення сетак, што прыйшлі ў нягоднасць з-за фізічнай і маральнай зношанасці элементаў электрасетак, — расказаў ён.

Пры гэтым, каб электрасеткі маглі выкарыстоўвацца для патрэб ацяплення, гарачага водазабеспячэння і гатавання ежы, недастаткова проста аднавіць іх папярэдні стан. Неабходна павялічыць іх прапускную здольнасць, што ў сваю чаргу патрабуе значна большых капіталаўкладанняў.

Адной з дадатковых крыніц фінансавання энергетыкі бачаць магчымасць удзелу грамадзян у фінансаванні работ па будаўніцтве размеркавальных электрасетак да адасобленых дамоў і рэканструкцыі сетак у раёнах індывідуальнай жылой забудовы. Мяркуецца, што беларусы будуць аплачваць 30 % ад каштарыснага кошту такіх работ, растэрміноўкі не прадугледжана.

Ірына СІДАРОК.

Дзейныя асобы

«ВІНАГРАД — ГЭТА НЕ ПРОСТА ЗАХАПЛЕННЕ, ГЭТА — ФІЛАСОФІЯ ЖЫЦЦЯ», —

кажа Аляксандр БУГАЕЎ, будаўнік, які стаў вінаградарам

Сёння ў яго гадавальніку больш за сотню сартоў гэтай, здавалася б, зусім не наскай расліны. І як ён да яе прыйшоў — расповед доўгі.

— Нарадзіўся і вырас у Светлагорску, скончыў сярэднюю школу № 1 і тэхнічнае вучылішча, адслужыў у войску, вярнуўся, працаваў мулярам, прычым не толькі тут, але і ў Маскве, Кіеве, Барнауле, — згадвае Аляксандр. — Усё як звычайна было і потым: сям'я, дзеці... Адзінае — змалку захапляўся кнігамі і раслінамі. Увесь свой вольны час праводзіў у вёсцы Самараж, дзе жыў мой прадзед. Мы з ім плялі кашы, збіралі розныя зёлкі.

Па іх я хадзіў і з бабуляй. Ад яе мае першыя веды... А да вінаграду прыахвоціў Павел Пятровіч Піскоў. Ён стаў маім першым настаўнікам, ад яго мая цікавасць да розных сартоў, разам з якой прыходзіла разуменне, што вінаград — гэта не проста захапленне, а яшчэ і філасофія жыцця. Не раз, калі настрой быў, мякка кажучы, ніякі, прыходзіў на вінаграднік — і адразу адчуваў, як усе мае клопаты ды трывогі адыходзяць на задні план. У вінаграду вельмі шырокі спектр карыснасці: гэта і ласунак, і лекі, і здаровае харчаванне для нашых дзяцей... У нейкі момант адчуў, што чым глыбей цікавішся вінаградарствам, тым больш разумееш, што гэта своеасаблівы, невядомы нам свет.

— А чаму для вінаградніку выбрана вёска Карпавічы?

— Яна самая паўднёвая ў Светлагорскім раёне. Да таго ж там найбольш прыдатная структура глебы. Дарэчы, разводзіць вінаград я пачынаў у горадзе, на дзесяці «сотках» зямлі. На новы ўчастак пераходжу паступова.

— У вас расце больш за сотню сартоў. А колькі іх існуе наогул?

— Больш за 5 000 разам з гібрыднымі формамі. Лічба паказвае, што вінаград вельмі пластычны, відазмяняецца ў залежнасці ад кліматычных умоў.

У мяне — магу ўдакладніць — 108 сартоў. Адзін куст займае шэсць квадратных метраў. Жыць на адным месцы можа больш за 100 гадоў. У Еўпаторыі з часоў Аляксандра II расце «крымскі мускат».

— А які сорт можна лічыць самым беларускім?

— Думаю, «краса Поўначы». Ён вылучаецца вялікай колькасцю фоліевай кіслаты. Вельмі карысны для людзей з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі. І не толькі. Нашымі можна прызнаць «альфу», «Лідзію ружовую»...

— Чаму тады Беларусь не лічаць вінаградная краінай?

— З гэтым я не пагаджуся. Вядома, што вінаград разводзілі яшчэ Радзівілы. А ўжо нам дык сам Бог загадаў! Галоўная небяспека — першы замаразак. І на зіму яго трэба ўцяпляць, бо пупышкі могуць распусціцца зарана.

— Ці плануеце самі заняцца селекцыяй? Ці можа пераапыляцца вінаград розных сартоў?

— Пакуль што я напрацоўваю матэрыял, рыхтуюся да эксперыменту. Калі атрымаецца вывесці новы сорт, назаву яго «святліцай» у гонар нашага народнага вакальнага ансамбля. Удзельніцам паабяцаў... Але патрэбен зыходны матэрыял. А гэта, у сваю чаргу, — чатыры-пяць гадоў. Ёсць, карацей, стымул, каб жыць доўга.

. А наконт пераапылення... Так, суседнія кусты пераапыляюцца паміж сабой. Але смак, колер, тэрмін паспявання пры гэтым не мяняюцца. Пераапыленне — цалкам звычайная прыродная з'ява, нават вельмі патрэбная. Яна гарантуе сакавітую і смачную ягаду, буйныя гронкі. Такім спосабам карыстаюцца і садоўнікі-аматары, і дасведчаныя вінаградары, якія разводзяць культуру на плантацыях ці ў вінаградніках. Яны нават раяць саджаць побач розныя сарты. А вось размяшчаць на адным участку паўднёвыя і паўночныя віды не рэкамендуецца. Яны прывыклі да розных умоў вырошчвання, паспяховага суседства ў такіх раслін не атрымаецца.

— Кожны селекцыянер жадае атрымаць плады як мага буйнейшыя. Вы таксама?

— Чалавек, як высвятляецца, любіць вачыма. Мае наведвальнікі спачатку спрабуюць вінаград на смак, аднак потым, выбіраючы сорт, перавагу аддаюць не смачнейшаму, а таму, што лепш выглядае... Я ж клапачуся пра якасць: пра тое, каб вінаград быў устойлівы да хвароб і шкоднікаў.

— Такіх энтузіястаў, як вы, сустрэнеш нячаста. Не было жадання стварыць клуб аматараў вінаграду, далучыць да яго недасведчаных?

— Энтузіястаў якраз шмат. І жаданне такое маецца, але на ўсё зноў-такі патрэбен час.

— Ці ёсць у Беларусі прамысловае вінаградарства?

— Прамысловыя пасадкі ёсць у Мазыры, у Самахвалавічах Мінскага раёна. Але там — тэхнічныя сарты. Развядзенне сталовых (у прамысловых маштабах) у нас, наколькі вядома, не займаецца ніхто. І перспектыў для гэтага пакуль няма, бо не акупяцца ўсе выдаткі. Патрэбны або вялікія цяпліцы, або вывядзенне адмысловых сартоў, як гэта робіцца на базе даследчых інстытутаў у Новачаркаску, Растове, Анапе... Дарэчы, вінаград, як вядома (нароўні з пшаніцай), — найстаражытнейшая культура. Мяняецца клімат, з'яўляецца магчымасць развядзення новых відаў. Па прагнозах навукоўцаў Міжнароднага саюза аховы прыроды, з-за змен клімату да 2050 года на поўдні Францыі і Італіі не застанецца вінаграднікаў, зона вінаградарства перамесціцца ў Скандынавію, Вялікабрытанію, Расію і Беларусь.

Вінаград любіць лёгкія глебы, не патрабуе шмат догляду: трэба толькі не запускаць куст і правільна яго абразаць. Першы ўражджай можна збіраць ужо на другі ці трэці год пасля пасадкі. Вільгаці ў нашых умовах вінаграду хапае, добра развітая каранёвая сістэма дастае яе сама. Акрамя таго, яна выцягвае з глебы шмат калію. Вядома, што якраз з яго (на 70 %) вінаград і складаецца. Гэта значыць, што пад расліну трэба рэгулярна ўносіць калійныя ўгнаенні.

...З Аляксандрам Бугаевым мы гаварылі яшчэ пра ампелаграфію — навуку пра вінаград, сарты і іх клоны, пра тое, што з дапамогай геномнага рэдагавання можна паляпшаць першапачатковыя ўласцівасці, пра генетыку ў вінаградарстве і сельскай гаспадарцы наогул.

І я ўжо сам не веру, што гутару з... мулярам.

Ізяслаў КАТЛЯРОЎ.

Дзякуй!

«ДВОР НАШ ЦЯПЕР НЕ ПАЗНАЦЬ!»

З газетай «Звязда» сяброўства ў нас вельмі даўняе. Мы пазнаёміліся пасля таго, як з нашых зямель — нарэшце! — прагналі немцаў, і мы, дзеці, змаглі пайсці ў школу.

Ні падручнікаў, ні сшыткаў у нас тады не было. Чытаць і пісаць вучыліся на чым давядзецца, найчасцей — на кавалачках, абрыўках газет, каб потым, падросшы, іх жа выпісваць.

Падпісчыцай «Звязды» я стала адразу пасля таго, як пайшла працаваць, і не кінула пасля таго, як скончыла: шмат знаходжу цікавага і карыснага, чытаю, нават пішу — для таго каб паведаміць, што апошнія гады (нават дзесяцігоддзі!) наш двор знаходзіўся, мякка кажучы, у вельмі непрыглядным стане! На асфальце — яміна на яміне, усюды беспарадак...

Але ж мы, жыхары дамоў нумар 6 і 8 па вуліцы Гагарына, дачакаліся, можна сказаць, свята: не так даўно ў нашым двары з'явіліся работнікі ДРБУ-123, некалькі дзён папрацавалі і навялі такую прыгажосць — прыемна паглядзець! У нас цяпер новенькі асфальт, парадак: двор наш стала не пазнаць!

А таму ад імя ўсіх жыхароў хачу шчыра падзякаваць гэтым працаўнікам, пажадаць ім поспехаў у іх вельмі патрэбнай рабоце.

В. І. САХНЕВІЧ,

г. Жодзіна.

Нельга забыць

ЗАГІНУЛЫХ ЧАКАЮЦЬ ВЕЧНА

Прыемна глядзець, як суботняй раніцай гарадскія жыхары раз'язджаюцца па лецішчах і вёсках. Неяк цёпла ўнутры ад пачуцця, што людзі ўсе ж такі памятаюць свае карані, цягнуцца да зямлі, імкнуцца да ўспамінаў. Я таксама з ліку гарадскіх: еду па знаёмай дарозе Мінск — Гродна на радзіму сваіх бацькоў. З дзяцінства памятаю кожны паварот трасы, яе аўтобусныя прыпынкі. Ціхія, залітыя сонцам, палі, магутная Налібоцкая пушча. Але і сярод гэтых спакойных мясцін ёсць незагойная рана, якая адгукнецца болем кожнаму беларусу.

Вёска Доры, што за 20 км на ўсход ад Валожына, адна з многіх сясцёр Хатыні.

У гады Вялікай Айчыннай, падчас аперацыі «Герман», 23 ліпеня 1943 года, немцы спалілі ў дорскай царкве 146 мясцовых жыхароў, у тым ліку 36 дзяцей. Гісторыкі пішуць, што карная аперацыя ў гэтым раёне была праведзена ў адказ на знішчэнне нямецкага гарнізона ў мястэчку Івянец. Галоўнай мэтай вермахтаўцы ставілі ліквідацыю партызанскіх атрадаў, асабліва ў Налібоцкай пушчы. Адказнай за падзеі ў Дорах і суседніх вёсках лічыцца баявая група Дырлевангера, асабліва штрафны батальён. Літаральна за 3-4 дні немцы знішчылі каля 11 вёсак Валожыншчыны і больш за 300 чалавек, але трагедыя Дораў — самая крывавая з усіх, калі ўвогуле можна параўноўваць чалавечыя пакуты.

У той дзень, 23 ліпеня, эсэсаўскі атрад увайшоў у Доры. Жыхароў падзялілі на дзве часткі: адну збіраліся адправіць у Германію, а другую, з дзяцей, жанчын і старых, сагналі ў царкву.

З архіўных дакументаў вядома, што з таго агню выратаваліся толькі тры чалавекі. Адзін з іх — дзесяцігадовы Іван Рудовіч. Вось што ён успамінае:

«Немцы прыйшлі ў вёску ў абедзенны час і пачалі выцягваць усіх з хат, быццам на малебен. Тых, хто спрабаваў уцячы, расстрэльвалі на месцы. Сагнаўшы ўсіх людзей у царкву, немцы прынеслі два бітоны бензіну. Нехта з натоўпу сказаў, што нас будуць паліць... Дзікія крыкі, лямант і плач запоўнілі памяшканне старой царквы. Гэтае слова — «паліць» — так мяне ўразіла, што я, здаецца, без разумення, пачаў у паніцы лётаць па царкве, заглядаць у кожны куток. Мне ўдалося знайсці нейкі невялічкі пакой, схаваны за чорнай шторай. Драўляныя дошкі падлогі пада мной праламаліся ці проста ссунуліся, і я звалiўся на бок. Адчуўшы пустую прастору, пачаў паўзці скрозь цемру і раптам заўважыў промні святла. Я падумаў, што яно павінна ісці з-за сцяны царквы, і папоўз насустрач... Праз некаторы час мае рукі дакрануліся да халоднага падмурка, з якога ўдалося адкаціць велікаваты камень. Далей, я памятаю, былі нейкія глухія размовы на чужой мове, вузкая паласа сенакосу і наша рэчка Даранька. Калі я азірнуўся на царкву і вёску, то ўбачыў толькі чорны-чорны дым...»

Прыдарожная вузкая алея і шум зялёных дрэў. У 1991 годзе на месцы трагедыі адкрылі мемарыяльны комплекс пад назвай «Загінулых чакаюць вечна». Уздоўж алеі ўстанавілі шыльды з імёнамі жыхароў Дораў, якія змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай. Вышэй, на невялікім узгорку, каля падмурка старой царквы, пяць жанчын са смуткам і болем на тварах і дзяўчынка — як сімвал розных пакаленняў, якія знішчыла вайна. Пасярэдзіне падмурка, які перажыў той пажар, засталося і некалькі помнікаў — «забітым і спаленым немцамі».

...Калі мы ўжо сыходзілі, да мемарыяла пад'ехала яшчэ адна машына. Пакуль людзі памятаюць вайну, яе быць не павінна.

Марыя ТАРНАЛІЦКАЯ,

г. Мінск.

Весткі з месцаў

«ДЗЕ МОЙ КРАЙ? ТАМ, ДЗЕ ВЕЧНУЮ ПЕСНЮ ПЯЕ БЕЛАВЕЖА...»

У канцы 2021 года ў Савеце Рэспублікі ў рамках супрацоўніцтва дзяржаўных органаў і Беларускай праваслаўнай царквы прайшоў тэматычны круглы стол «Чысціня слова — чысціня душы». Па выніках яго работы былі прыняты адпаведныя рэкамендацыі і аб'яўлены конкурс творчых работ, мэта якога — звярнуць увагу (найперш маладых) на моўную культуру. Да ўдзелу ў конкурсе прымаліся відэазапісы паэтычных твораў альбо ўрыўкаў з празаічных, якія маюць прызнаную культурную і мастацкую каштоўнасць. Віталіся і ўласныя...

Па ініцыятыве протаіерэя Мікалая Змушкі, благачыннага Чавускай царкоўнай акругі, падтрыманай ідэалагічным аддзелам райвыканкама, да ўдзелу ў конкурсе далучылася вучнёўская моладзь горада і раёна.

Днямі сталі вядомыя вынікі: усяго на конкурс даслана 180 работ, прычым не толькі з Беларусі, але і з Расіі, Казахстана, Азербайджана... Што прыемна, сярод пераможцаў — наша Валерыя Буянава, выпускніца Гарбавіцкай сярэдняй школы, якая прадэкламавала верш Уладзіміра Караткевіча «Беларуская песня».

Валерый ГАЎРЫШ,

г. Чавусы.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Урокі псіхалогіі

ЧОРНЫ — КОЛЕР УЛАДЫ, БЕЛЫ — РАШУЧЫХ ЛЮДЗЕЙ

Што могуць расказаць пра нас колеры нашага адзення?

Колер, якому аддае перавагу чалавек, можа многае расказаць пра яго асобу. Ваш любімы колер — колер вашай персоны. Ён паказвае нашы асноўныя характарыстыкі і моцныя бакі.

— Калі вам падабаецца чырвоны, вы ўпэўнены чалавек, які аддае перавагу актыўнаму спосабу жыцця. Аранжавы азначае, што вы таварыскі чалавек, якому падабаецца быць у групавых сітуацыях. Таксама аранжавыя адценні часта выбіраюць добрыя арганізатары. Сарамлівыя людзі аддаюць перавагу зялёнаму. Асобы з лёгкім і спакойным характарам выбіраюць блакітны, — расказвае **псіхолаг Мінскага гарадскога клінічнага цэнтра псіхіятрыі і псіхатэрапіі Вольга ШАБАЛІНСКАЯ.**

Фіялетавы колер паказвае, што вы надзейныя і працавітыя. Чорны — колер улады, часта дамінуе ў адзенні кіраўнікоў і дырэктараў. Карычневае адзенне кажа пра тое, што вы прыязны чалавек, які любіць клапаціцца аб сям'і і сябрах. Шмат белага адзення ў гардэробе ў рашучых і самастойных людзей.

— Важны таксама колер, які чалавек не любіць. Ён паказвае, якім чалавек хацеў бы быць. Напрыклад, вы не любіце чырвоны, таму, магчыма, вам не хапае ўпэўненасці ў сабе. Не носіце адзенне аранжавага колеру — можа быць, вы хацелі б быць больш таварыскімі.

Карысныя парады

СУП: ЕСЦІ ЦІ НЕ?

У нашай культуры суп — вельмі папулярная страва, і амаль кожны ў дзяцінстве чуў, што яго трэба есці абавязкова. І сёння многія з нас упэўненыя, што гэта адна з асноў правільнага харчавання. Прыхільнікі еўрапейскага харчавання з гэтым нязгодныя: яны сцвярджаюць, што здароўе не пацерпіць, калі суп не есці штодня. Хто ж мае рацыю? Ці неабходны суп усім? Ён сапраўды карысны, ці ёсць нейкія выключэнні? Які суп лепшы? Разбіраемся ў гэтым разам з урачом-гігіеністам Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Інгай ФЯДОТКАВАЙ.

Суп — шматкампанентная страва, у склад якой уваходзяць вадкая і цвёрдая часткі. Прычым правільна прыгатаваны суп — гэта збалансаваны набор бялкоў, тлушчаў і вугляводаў, а таксама вітамінаў, мінералаў і вадкасці.

ЯКІ СУП ЛЕПШЫ?

Суп можна варыць на мясным булёне, але выбіраць трэба нятлустае мяса (курыца, індычка), з птушкі здымаць скуру, каб прыбраць лішні халестэрын і калорыі. Мясны булён трэба давесці да кіпення, зняць пенку і варыць яшчэ некалькі хвілін, пасля чаго ўвесь булён зліць, мяса заліць чыстай вадой і суп варыць на другім булёне.

— Гэта паменшыць у булёне колькасць антыбіётыкаў, халестэрыну і экстрактыўных рэчываў, якія павялічваюць выпрацоўку салянай кіслаты і павышаюць кіслотнасць страўнікавага соку, у сувязі з чым супы на наварыстых мясных булёнах не рэкамендуецца есці людзям з павышанай кіслотнасцю (язвавай хваробай, гастрытам). Між іншым, з адварнога мяса бялок засвойваецца лепш, — тлумачыць урач.

Можна варыць агароднінныя супы. Чым больш разнастайнай гародніны ў ім прысутнічае і чым больш яна рознакаляровая, тым больш карысці прынясе. Аднак гародніну не варта смажыць на алеі і сале. Яе трэба закідваць у канцы гатавання, пачынаючы з той, якая варацца даўжэй. Зялёніва ж наогул дадаюць у самым канцы, выключыўшы канфорку. Так захаваецца больш карысных рэчываў.

Рыбны суп — таксама добры варыянт, аднак варта памятаць, што марская рыба вельмі тлустая, хоць і змяшчае «карысныя» тлушчы. Акрамя таго, у рыбе можа ўтрымлівацца свінец, так што рыбны суп трэба варыць на другім булёне, як і мясны.

Суп-пюрэ смачная, аднак часта вельмі каларыйная страва, калі варыць яго на вяршках і са сметанковым маслам, дадаўшы ў канцы грэнкі. Лепш гатаваць яго на вадзе або булёне з вялікай колькасцю гародніны. Такі суп будзе служыць крыніцай вітамінаў, мікра- і макраэлементаў, а таксама заменіць адну або некалькі з пяці рэкамендаваных Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя порцый гародніны для тых, хто не жадае есці гародніну ў іншым выглядзе. А гародніна — гэта асноўная крыніца клятчаткі, якая стымулюе работу страўнікава-кішачнага тракта.

У суп можна дадаваць крупы і макарону, але важна, каб гэта былі складаныя вуглеводы, гэта значыць цэльныя злакі. Дадавайце толькі адзін від круп або макароны з цвёрдых сартоў пшаніцы.

НЕКАТОРЫЯ МІФЫ

Суп не разбаўляе страўнікавы сок, не зніжае ўзровень стрававальных ферментаў.

У супе ўсё роўна застаюцца вітаміны і мікраэлементы, галоўнае — правільна яго варыць.

Гэта не дыетычная страва. Тлустая салянка, засмажаная гародніна для супу, тлусты мясны булён, рыбны суп могуць справакаваць абвастрэнне захворванняў страўнікава-кішачнага тракта або сардэчна-сасудзістай сістэмы.

ЦІ АБАВЯЗКОВА ЯГО ЎЖЫВАЦЬ?

Суп можа быць паўнавартасным, збалансаваным прыёмам ежы пры правільным інгрэдыентным складзе і спосабе гатавання.

Суп не абавязкова есці кожны дзень, дастаткова два-тры разы на тыдзень.

Страўнік можа працаваць і без «стымуляцыі» супам.

Суп дапамагае ў аднаўленні балансу вадкасці ў арганізме.

ЯК ПРАВІЛЬНА ГАТАВАЦЬ?

- варыце супы на другім булёне;
- здымайце тлушч і пену, якія ўтвараюцца падчас варэння;
- саліце, як толькі вада пачала закіпаць;
- выкарыстоўвайце спецыі і розныя травы;
- варыце на слабым агні;
- старайцеся, каб памер гародніны і іншых інгрэдыентаў быў такім, каб прадукт не даводзілася дзяліць на часткі лыжкай у талерцы;
- падрыхтаваныя прадукты закладвайце ў кіпячы булён, пачынаючы з тых, што найбольш цяжка разварваюцца;
- у працэсе варэння падтрымлівайце стан пастаяннага ціхага кіпення. Для гэтага наступны прадукт закладвайце толькі пасля аднаўлення кіпення.

А вы ведалі?

УСЕ СВАЕ!

Як правільнае харчаванне дапамагае захаваць здаровыя зубы

Адной з найбольш частых праблем у стаматалагічнай практыцы з'яўляецца карыес, знаёмы практычна кожнаму на планеце. Якія прычыны правакуюць яго з'яўленне, як з ім змагацца і ці можна не дапусціць карыёзнага разбурэння зубоў? Аказваецца, многае залежыць ад нашага харчавання. Менавіта з ежай мы атрымліваем усе неабходныя рэчывы і элементы, з якіх будуюцца цвёрдыя структуры зуба, тканкі перыядонту і іншых органаў поласці рота. Незбалансаванае харчаванне і празмернае ўжыванне некаторых прадуктаў можа прывесці да развіцця розных парушэнняў у арганізме. Гэта, у прыватнасці, адносіцца да вугляводаў.

— Зубы дзяцей, якія злоўжываюць прысмакамі — ледзянцамі, снікерсамі, салодкай вадой — значна больш пашкоджаны карыесам. Разам з тым, важнае значэнне мае не толькі час, калі гэтыя прысмакі ядуць, але і як доўга іх трымаюць у роце і колькі разоў яны ўжытыя на працягу дня, — звяртае ўвагу **дзіцячы ўрач-стаматолаг стаматалагічнага аддзялення 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Ала ГРЭБНЕВА.** — Неабходна прывучаць дзяцей з ранняга ўзросту да абмежавання кандытарскіх вырабаў. Калі трэба перакусіць паміж асноўнымі прыёмамі ежы, то звыклыя прысмакі лепш замяніць грубым хлебам, несалодкім кефірам, сырам, малаком або гароднінай, напрыклад, морквай, яблыкамі.

Вельмі кіслыя садавіна і напоі таксама разбураюць зубы, калі іх ужываць часта і доўга — гадамі. Паводле даследаванняў, газаваныя напоі, няхай гэта будуць імпартная кола або айчынныя ліманады, трэба піць толькі праз саломінку. Так можна знізіць рызыку разбурэння эмалі зубоў.

Адмоўныя бакі вуглявадзістай ежы не азначаюць поўнай забароны як спосабу прафілактыкі карыесу, паколькі яна неабходная для нармальнай жыццядзейнасці арганізма.

Дастаткова знізіць спажыванне да аптымальнага ўзроўню. Такім чынам, варта абмежаваць прыёмы ежы да 5 разоў на дзень, уключаючы перакусы; паменш і радзей ужываць прадукты і напоі, якія змяшчаюць цукар; салодкая страва не павінна быць апошняй у рацыёне, не трэба есці салодкае на ноч; прадукты, якія прымаем апошнімі, павінны добра чысціць зубы (яблыкі, агуркі, морква). Таксама рэкамендуецца знізіць спажыванне прадуктаў, якія змяшчаюць кіслату, а ліманады і сокі піць праз саломінку.

Немалаважнае значэнне ў папярэджанні стаматалагічных захворванняў маюць бялкі, тлушчы, мінеральныя солі, вітаміны. Асабліва месца займаюць мікраэлементы, у прыватнасці, кальцый і фтор. Фтор спрыяе павышэнню ўстойлівасці цвёрдых тканак зуба да карыесу.

На фтарыды багатыя марская рыба (скумбрыя, сардзіны) і кансервы з яе, марская капуста, вышэйшыя гатункі грузінскага чаю, грэцкія арэхі, персікі, пятрушка, мінеральная вада «Дарыда», «Пратэра», «Лазараўская», «Баржомі». Каб зубная эмаль атрымала фтор, рэкамендуецца затрымліваць у роце кожную порцыю вады перад праглынаннем.

Даследаванні вынікаў айчыннай праграмы фтарыравання харчовай солі паказалі, што яе спажыванне дазволіла знізіць захваральнасць на карыес сярод дашкольнікаў і школьнікаў.

Найбольш дэфіцытны элемент у нашым рацыёне — кальцый, бо яго лёгказасваяльныя злучэнні ўтрымліваюцца ў нешматлікіх прадуктах, пераважна малочных і раслінных. Найбольш багатыя на засваяльны кальцый капуста, бульба, агрэст, грачаныя і аўсяныя крупы, соя, фасоля, малочныя і кісламалочныя прадукты — малако, кефір, ёгурт, сыр, тварог.

Здаровыя зубы немагчыма ўявіць без прымянення вітамінаў. Лепш за ўсё атрымліваць вітаміны натуральным шляхам, таму што ў прадуктах харчавання яны ўтрымліваюцца ў неабходных арганізму спалучэннях. Так, вітаміны групы В у вялікай колькасці ўтрымліваюцца ў фасолі, гароху, грачанай і аўсянай крупах, крыху менш іх у макаронных вырабах, рысе.

З іншых неабходных вітамінаў трэба назваць вітаміны С і D. Добрай крыніцай вітаміну С з'яўляюцца малочныя прадукты, квашаная капуста, памідоры, асабліва багатыя на яго плады шыпшыны, чорныя парэчкі, лімоны. Вітамін D у вялікай колькасці змяшчаецца ў печані траскі, яечным жаўтку, сметанковым масле. Важнасць прызначэння вітаміну D для прафілактыкі карыесу зубоў абумоўлена актыўным удзелам яго ў абмене кальцыю і фосфару ў арганізме. Пры недастатковым паступленні вітамінаў з ежай трэба прымаць полівітамінныя прэпараты.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
6 ліпеня 2022 г. № 25 (661)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

СУМЫ ТОЛЬКІ РАСТУЦЬ

Сёлета плануецца падпісаць 65 саюзных пагадненняў

На пляцоўках Форуму рэгіёнаў адбылося дзявятае пасяджэнне міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве. Парламентарыі дзвюх краін абмеркавалі рэалізацыю 28 саюзных праграм. Асаблівая ўвага была ўдзелена пытанням імпартазамяшчэння.

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ заўважыў, што міжпарламенцкая камісія — гэта эфектыўная дыялогавая пляцоўка, якая дае выдатную магчымасць адкрыта і комплексна абмеркаваць ключавыя кірункі саюзнага будаўніцтва, ролю беларускіх і расійскіх рэгіёнаў у іх рэалізацыі.

Як паведаміў **намеснік старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Юрый ВАРАБ'ЁЎ,** сёлета плануецца падпісаць каля 65 саюзных пагадненняў. «Вынікі работы над гэтымі пагадненнямі павінны быць на паверхні, каб мы ведалі пра іх і маглі нешта палепшыць, — дадаў ён. — Таму мы вырашылі наступны год прысвяціць кантролю за дагаворамі ў рамках гэтых пагадненняў. Мы, напэўна, наведаем рэгіёны нашых дзяржаў, каб паглядзець, як рэалізоўваюцца гэтыя пагадненні. Нашы рэгіёны ўсё больш і больш хочуць супрацоўнічаць».

Заключэнне дагавораў паміж рэгіёнамі станоўча адбіваецца на эканоміцы. «Тавараабарот паміж такімі рэгіёнамі вырас на 25 — 40 %, мы лічым, гэта вельмі высокае дасягненне, — канстатаваў Юрый Вараб'ёў. — Форум паказвае пэўныя вынікі, што нас вельмі радуе. Аднак хацелася б падысці да гэтага больш прадметна».

Акрамя таго, на пасяджэнні парламентарыі прааналізавалі ход выканання рашэнняў VIII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які быў прысвечаны пытанням навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва ў кантэксце лічбавізацыі.

— Усю работу, якая была арганізавана ў постфорумны перыяд у рамках рэалізацыі выніковага дакумента, можна структураваць па наступных блоках: узаемадзеянне ў навукова-тэхналагічнай сферы, заканадаўчыя ініцыятывы, нарошчванне гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва, маладзёжная павестка, — расказала **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ.** — Ключавая выснова — асноўныя мерапрыемствы і праекты рэалізаваныя.

Гаворачы аб значэнні форумаў рэгіёнаў, сенатар выказала меркаванне аб важнасці камерцыйных кантрактаў, якія падпісваюцца ў рамках іх падрыхтоўкі. «У праектным партфелі — не толькі прадукцыя сельскай гаспадаркі і харчаванне, а і інвестыцыйныя тавары, тэхніка, нафтахімічная прадукцыя, — адзначыла Таццяна Рунец. — Пазітыўна, што сума кантрактаў ад форуму да форуму ўзрастае. Калі на другім форуме аб'ём здзелак склаў усяго 230 мільёнаў долараў, то на мінулым, які з-за пандэміі адбыўся ў анлайн-фармаце, агульная сума кантрактаў склала 850 мільёнаў долараў».

Сёлета — лічба яшчэ большая. У рамках пасяджэння таксама былі падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве і развіцці адносін паміж абласнымі Саветамі дэпутатаў Беларусі і заканадаўчымі органамі дзяржаўнай улады суб'ектаў Расіі.

Вераніка КАНЮТА.

Фота БелТА.

НА ПРЫНЦЫПАХ ПАДТРЫМКІ І ЎЗАЕМАПАВАГІ

Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі стаў самым рэзультатыўным за ўсю гісторыю

На мінулым тыдні горад Гродна стаў эпіцэнтрам беларуска-расійскай садружнасці. За два дні работы форуму заключана каля 60 пагадненняў аб міжрэгіянальным супрацоўніцтве, падпісана кантрактаў на суму звыш 2,5 мільярда беларускіх рублёў. Яшчэ больш плённае ўзаемадзеянне паміж дзвюма братэрскімі краінамі наладжана ў бізнесе, прамысловасці і сельскай гаспадарцы, навуцы і адукацыі.

ВЫКЛЮЧНАЯ РОЛЯ САЮЗА

Форум, які праводзіцца пад эгідай Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі, ужо даўно стаў неад'емным складнікам расійска-беларускага партнёрства. З кожным годам міжрэгіянальнае супрацоўніцтва набірае абароты. Калі ў першым форуме ўдзельнічалі прадстаўнікі 19 рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі, то ў другім — ужо ў два разы больш. На трэцюю сустрэчу прыбылі прадстаўнікі 43 расійскіх рэгіёнаў, на чацвёртую — 80... Агульная штогадовая колькасць удзельнікаў форуму вырасла ад 300 да больш як тысячы чалавек. За гады яго правядзення было падпісана звыш 400 пагадненняў і некалькі тысяч камерцыйных кантрактаў.

IX Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі стаў рэкордным і па колькасці ўдзельнікаў у ім, і па колькасці падпісаных дакументаў аб супрацоўніцтве. Асаблівае значэнне ўзмацненне двухбаковых адносін набывае ў сучасных рэаліях, калі і Беларусь, і Расія падвяргаюцца беспрэцэдэнтнаму знешняму палітычнаму і эканамічнаму ціску.

Высокі ўзровень інтэграцыі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі — асабістая пазіцыя двух лідараў. Пра тое, што форум мае вельмі істотнае значэнне ў двухбаковым супрацоўніцтве, сведчыць і тое, што да ўдзельнікаў мерапрыемства па відэасувязі звярнуліся прэзідэнты дзвюх краін — Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін, якія падкрэслілі, што саюз Беларусі і Расіі мае выключную ролю ў інтэграцыйных працэсах.

НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ

Сёлетні форум праходзіў пад тэмай «Роля міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ў паглыбленні інтэграцыйных працэсаў у межах Саюзнай дзяржавы». Ключавыя пытанні ў рамках двухбаковага супрацоўніцтва абмяркоўваліся падчас шасці секцый: «Заканадаўства Саюзнай дзяржавы: сучасны стан і асноўныя кірункі далейшага збліжэння», «Супрацоўніцтва Расіі і Беларусі ва ўмовах новай міжнароднай кліматычнай павесткі», «Беларуска-расійскае ўзаемадзеянне ў сферы АПК як найважнейшая ўмова забеспячэння харчовай бяспекі Саюзнай дзяржавы», «Адзіная навукова-тэхнічная прастора Расіі і Беларусі як фактар забеспячэння глабальнай канкурэнтаздольнасці і бяспекі Саюзнай дзяржавы», «Інтэграцыя сістэмы вышэйшай адукацыі Расіі і Беларусі: рэгіянальны аспект», «Эфектыўнае імпартазамяшчэнне ў Саюзнай дзяржаве: праекты, стымулы, каардынацыя». Ключавыя рашэнні, прынятыя падчас секцый, леглі ў аснову шматлікіх дакументаў аб супрацоўніцтве.

Таксама на пляцоўках форуму сустрэліся маладыя заканадаўцы, кіраўнікі прадпрыемстваў і прадстаўнікі бізнес-супольнасцяў, міністэрстваў, канцэрнаў, банкаў, парламентарыі дзвюх краін. Выніковым мерапрыемствам, дзе былі выказаны канкрэтныя прапановы па далейшым удасканаленні беларуска-расійскага супрацоўніцтва і падведзены першыя вынікі Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, стала пленарнае пасяджэнне «Роля міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ў паглыбленні інтэграцыйных працэсаў Саюзнай дзяржавы».

— Вынікі форуму, як заўсёды, значныя, — падвяла першыя высновы **Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталля КАЧАНАВА.** — Гэты форум зарэкамендаваў сябе як выдатная пляцоўка, дзе мы з калегамі і партнёрамі можам абмеркаваць актуальныя для Беларусі і Расіі пытанні.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ДЫЯЛОГ І ПАМЯЦЬ У «ЛІЧБЕ»

На IX Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі маладзёжныя парламентарыі дзвюх краін падпісалі дагавор аб пашырэнні супрацоўніцтва.

Перад тым як паставіць свае подпісы пад дакументам, маладыя прадстаўнікі заканадаўчых Саветаў пры парламентах дзвюх краін абмяняліся думкамі і выказалі жаданне больш поўна развіваць партнёрскія сувязі, асабліва цяпер, ва ўмовах глабальных выклікаў.

Агульную пазіцыю выказаў старшыня Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Беларусі Ягор Макарэвіч. Ён адзначыў, што санкцыйны ціск у многім закранае і маладых людзей, бо скіраваны на тое, каб выклікаць недавер да кіраўніцтва сваёй краіны, урада. Таму важна, каб моладзь, у тым ліку маладыя парламентарыі, прадстаўнікі грамадскасці разумелі, наколькі важна аб'яднаць намаганні ў розных сферах. У большай ступені гэта датычыцца адукацыйных праграм, турыстычнага напрамку, інтэграцыі інфармацыйнай сферы.

— Логіка ў тым, каб маладыя лідары, якія тут прысутнічаюць, выкарысталі пляцоўку маладзёжнага парламента і былі арыентаваны на развіццё сяброўскага партнёрства. Падобны фундамент, які мы цяпер закладваем, дапаможа ў перспектыве захаваць усё тое, што напрацавана сёння, — заўважыў маладзёжны лідар.

А вось генерыраваць прапановы маладыя заканадаўцы могуць праз свае заканадаўчыя органы ў Беларусі і Расіі. Самае галоўнае, што ініцыятывы не застаюцца толькі на паперы. Цікавыя праекты знаходзяць падтрымку на самым высокім узроўні — як з боку кіраўніцтва краіны, так і дэпутацкага корпуса. Аналагічная падтрымка ёсць і ў маладых парламентарыяў з Расійскай Федэрацыі.

— Мы працуем з дэпутатамі і маем магчымасць уносіць свае прапановы па тых ці іншых законапраектах, якія разглядаюцца. І калі нядаўна Расійская Федэрацыя прымала закон аб маладзёжнай палітыцы, мы дзяліліся сваімі напрацоўкамі па гэтай тэме. У нас узровень прававога ўрэгулявання маладзёжнай палітыкі даволі глыбокі, існуе адпаведны закон, які эфектыўна працуе. Гэта відаць на прыкладзе працаўладкавання і льгот для маладых спецыялістаў. І мы гэтымі практыкамі дзелімся, — расказаў Ягор Макарэвіч.

Прыкладам узаемадзеяння паміж рэгіёнамі абедзвюх краін стаў праект па развіцці камфортнай гарадской інфраструктуры, у якім узялі ўдзел прадстаўнікі Мінска і Перміі. Праект быў прадстаўлены кіраўніцтву гарадоў і адзначаны ўзнагародамі.

Удзельнікі пасяджэння пагадзіліся, што заўсёды ахвотна дзеляцца паспяховымі практыкамі са сваімі калегамі, вучацца адно ў аднаго, пераймаюць вопыт.

— Мы зацікавіліся праектамі, якія звязаныя з лідарствам, глядзім, як будуецца работа нашых расійскіх калег з маладымі лідарамі. У сувязі з гэтым два гады таму наш Маладзёжны парламент выступіў з нацыянальным праектам «Каманда будучага». Яго сутнасць у тым, каб знаходзіць маладых беларусаў у розных рэгіёнах краіны і дапамагаць ім удасканальваць іх лідарскія якасці. І ў далейшым суправаджаць з пункту гледжання кар'ернага і асабіснага росту, — падзяліўся Ягор Макарэвіч.

— Мы ведаем, што ў Беларусі ёсць нямала цікавых напрацовак у адукацыі, культуры, спорце, — падкрэсліў **старшыня Палаты маладых заканадаўцаў пры Савеце Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Аляксандр САПРОНАЎ.** — Хочам абмяняцца вопытам і прымяніць гэтыя напрацоўкі ў нас. Напрыклад, мне вельмі падабаецца, што беларускія студэнты, якія толькі прыходзяць у ВНУ на першы курс, ужо ведаюць, дзе будуць працаваць. Гэта вельмі добры прыклад, калі чалавек уяўляе сабе сваю будучую прафесію. У Расіі гэта пакуль не так дакладна, але мы таксама збіраемся ў сябе такі падыход укараніць.

Прадстаўнікі абодвух маладзёжных парламентаў акрэслілі агульную пазіцыю — варта пашыраць супрацоўніцтва і працягваць курс на інтэграцыю. Выказвалася прапанова аб неабходнасці агульных мер падтрымкі для працоўнай моладзі дзвюх краін, напрыклад, укараненне агульнай тарыфнай сеткі і сацыяльныя гарантыі.

Новыя пункты росту вызначыў першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр Лук'янаў. Ён унёс прапанову па ўкараненні турыстычнага кэшбэка для грамадзян Расіі. Адзначалася, што на нядаўнім Беларуска-расійскім маладзёжным форуме, які прайшоў у Брэсце і сабраў прадстаўнікоў усіх абласцей Беларусі і 20 рэгіёнаў Расіі, быў адноўлены праект па алічбоўцы памятных мясцін. Гэта дасць магчымасць атрымаць інфармацыю і прыцягнуць расійскіх гасцей на гістарычныя аб'екты Беларусі, лічыць прадстаўнік беларускай моладзі.

Маладыя парламентарыі ўзялі ўдзел у адкрыцці новай версіі праекта «Лічбавая зорка». Урачыстасць прайшла ў гарадскім парку імя Жылібера, каля Вечнага агню і помніка загінулым воінам. Для таго каб даведацца аб канкрэтных помніках Вялікай Айчыннай вайны, дастаткова адсканаваць QR-код, размешчаны на спецыяльным пюпітры.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

НА ПРЫНЦЫПАХ ПАДТРЫМКІ І ЎЗАЕМАПАВАГІ

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Сёлета тэмай абрана рэгіянальнае супрацоўніцтва ў паглыбленні інтэграцыйных працэсаў у межах Саюзнай дзяржавы, і дадзеная тэма як ніколі актуальная, бо ўзаемадзеянне паміж нашымі краінамі выйшла на абсалютна новы ўзровень. Гэтаму садзейнічае тая работа, якую праводзяць прэзідэнты нашых краін, урады і парламентарыі. Форум — яшчэ адно пацвярджэнне таму, што такая работа сапраўды важная і патрэбная.

Па словах спікера верхняй палаты беларускага парламента, падчас дзявятага форуму быў зроблены акцэнт на тым, што Беларусь і Расія павінны працаваць сумесна, вырашаючы пытанні па імпартазамяшчэнні. «Дзесьці не канкурыраваць, а там, дзе ў нас ёсць лепшыя кампетэнцыі ў плане эканомікі, прамысловасці, аграпрамысловага комплексу, развіваць іх, ствараючы сумесныя прадпрыемствы і тэхналогіі, — удакладніла яна. — Не менш важная для нас работа і па імпартазамяшчэнні ў сацыяльнай сферы: мы павінны працаваць на будучыню, на перспектыву. А гэта наша моладзь. Таму вельмі важнае супрацоўніцтва нашых маладзёжных арганізацый».

У першую чаргу, маюцца на ўвазе Маладзёжны савет, створаны пры Нацыянальным сходзе, маладыя парламентарыі з Расійскай Федэрацыі. Гэта і праект «Цягнік Памяці», дзякуючы якому школьнікі з дзвюх краін наведалі гарады Беларусі і Расіі і пазнаёміліся са знакавымі мясцінамі Вялікай Айчыннай вайны — такім чынам прычыніліся да подзвігу сваіх гераічных продкаў і ўшанавалі іх памяць. Паводле пераканання Наталлі Качанавай, патрыятычнае выхаванне не толькі моладзі, а і ўсяго грамадства ў цэлым павінна стаць асновай.

Як заўважыла пасля заканчэння форуму **Старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянціна МАЦВІЕНКА,** форум — гэта не проста пагаварыць, гэта абсалютна канкрэтныя вынікі, якія адчуваюцца. «З кожным годам усё больш з'яўляецца ўзаемнай зацікаўленасці ў такім рэальным эканамічным узаемадзеянні, рэальным гандлі, рэальнай кааперацыі, — падкрэсліла спікер верхняй палаты расійскага парламента. — За кожным падпісаным дакументам — канкрэтны праект: або сумеснае прадпрыемства, або аб'яднанне намаганняў прасоўвання той ці іншай галіны, або імпартазамяшчэнне. Акрамя такіх важных бягучых спраў, гэта яшчэ і сур'ёзныя думкі аб будучыні — як нам забяспечыць наш тэхналагічны суверэнітэт. Патэнцыял у нашых краін вялізны, упэўненая, што ўсё атрымаецца. Жаданне, імкненне, энтузіязм і сяброўства, якое склалася паміж кіраўнікамі рэгіёнаў, дае вялізны акумулятыўны эфект».

КЛЮЧАВЫЯ ПУНКТЫ ІНТЭГРАЦЫІ

Паколькі Расійская Федэрацыя была і будзе асноўным стратэгічным партнёрам Рэспублікі Беларусь, на ўзроўні суб'ектаў гаспадарання як ніколі высокая зацікаўленасць у глыбокай эканамічнай інтэграцыі. Таму задача беларускіх спецыялістаў у сферы АПК — так выбудаваць нашу адзіную прамысловую палітыку, каб не канкурыраваць на адных і тых жа ўчастках, а, наадварот, дапаўняць адзін аднаго ў розных сегментах рынку, садзейнічаць лагістыцы, прасоўванню кааперацыйнай прадукцыі ў трэція краіны.

Як расказаў **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Юрый НАЗАРАЎ,** час і сітуацыя дыктуюць нам неабходнасць аператыўна заняцца і стратэгічнымі задачамі. «Гаворка ідзе аб павелічэнні аб'ёмаў паставак тавараў, выбудоўванні доўгатэрміновай перспектывы развіцця эканомік, прамысловага і аграпрамысловага комплексаў такім чынам, каб Беларусь бачыла сваю эканамічную перспектыву побач і разам з Расіяй, — удакладніў віцэ-прэм'ер. — Кіраўнікамі нашых дзяржаў падтрымана рэалізацыя інтэграцыйных праектаў на суму каля паўтара мільярда долараў. На сённяшні дзень пад патрэбы прадпрыемстваў Расійскай Федэрацыі вызначана 11 праектаў. Прыярытэтная мэта ўсіх гэтых праектаў — стварэнне прадукцыі, запатрабаванай у Саюзнай дзяржаве».

Фота БелТА.

У прыватнасці, Мінскі трактарны завод плануе пастаўляць у Расію 20 тысяч трактароў на год. Аднак прадпрыемства на гэтым спыняцца не збіраецца: у перспектыве — экспартаваць у суседнюю краіну камунальную і лясную тэхніку. Як падзяліўся **генеральны дырэктар Мінскага трактарнага завода Віталь ВОЎК,** МТЗ гатовы замясціць усю імпартную тэхніку, якая пастаўлялася з-за мяжы. «Наша прадпрыемства з'яўляецца рэальным лакаматывам для развіцця прамысловай кааперацыі і загрузкі вытворчых магутнасцяў нашых дзяржаў, — акцэнтаваў увагу ён. — Трактарабудаванне дае ад сямі да 12 рабочых месцаў у іншых галінах. І з гэтых 12 месцаў прыкладна шэсць знаходзіцца ў Расіі».

Беларусь і Расія падпісалі пагадненне і аб супрацоўніцтве ў галіне племянной жывёлагадоўлі. Дакумент прадугледжвае прымяненне адзіных методык, ацэнку племяннога каштоўнасці жывёлін, правядзенне малекулярнай генетычнай экспертызы. У выніку плануецца стварыць селекцыйна-племянныя цэнтры на тэрыторыі дзвюх краін.

— Беларусь і Расія падышлі да высокага ўзроўню кааперацыі і інтэграцыі, і вялікую ролю ў гэтым адыграла міжрэгіянальнае супрацоўніцтва, — падкрэсліў **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Ігар БРЫЛО.** — Сёлета наша сельскагаспадарчая прадукцыя экспартуецца ў 71 рэгіён Расіі. Ёсць рэгіёны, з якімі дасягнута павелічэнне экспарту ад 150 % і вышэй. Сярод іх — Рэспубліка Карэлія, Кіраўская вобласць, Пермскі край, Калінінградская вобласць і іншыя. Нашы вышэйшыя навучальныя ўстановы маюць каля 200 дагавораў з аграрнымі ВНУ Расіі аб двухбаковым супрацоўніцтве ў адукацыйнай і навуковай сферах.

Наладжванне партнёрскіх узаемаадносін у адукацыі і навуцы — таксама істотны напрамак інтэграцыйных працэсаў Беларусі і Расіі. Акцэнт — на штучны інтэлект і лічбавыя тэхналогіі.

— Ва ўмовах санкцыйных абмежаванняў беларускія і расійскія навукоўцы не могуць знаходзіцца ў баку ад вырашэння актуальных задач устойлівага развіцця нашых эканомік, — адзначыў **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ.** — Форумы рэгіёнаў Беларусі і Расіі сталі для нас дзейсным інструментам па нарошчванні навуковых сувязяў. Сёння Акадэмія навук Беларусі актыўна ўзаемадзейнічае з больш як 30 рэгіёнамі і навуковымі цэнтрамі Расійскай Федэрацыі. Нам трэба нарошчваць наша супрацоўніцтва, рабіць яго канструктыўным, больш рэзультатыўным, ставіць перад сабой самыя амбіцыйныя задачы і ажыццяўляць праекты і ініцыятывы, якія не маюць аналагаў. Неабходна стварыць аб'яднаную айці-сістэму і інтэлектуальную прастору Саюзнай дзяржавы, распрацаваць разумныя смарт-сістэмы ў розных сферах і галінах, стварыць найноўшыя навуковыя распрацоўкі ў галіне штучнага інтэлекту і лічбавізацыі... Навуковая прастора Саюзнай дзяржавы павінна быць самадастатковай і незалежнай ад знешніх кан'юнктур.

Як паведаміла **намеснік міністра навукі і вышэйшай адукацыі Расіі Наталля БАЧАРОВА,** Расія і Беларусь аказаліся ў той сітуацыі, калі за вельмі кароткі перыяд часу патрэбна вырашаць праблемы з парушэннем навукова-тэхналагічнай сувязі з шэрагам дзяржаў. «У беларускага і расійскага бакоў ёсць набор кампетэнцый, якія пры сумеснай рабоце дадуць сур'ёзны сінергетычны эфект, — заўважыла намеснік міністра. — Патрэбна за кароткі прамежак часу пераадолець вялізныя перашкоды, якія дазваляюць стварыць тэхналогіі і распрацоўкі, здольныя замясціць заходнія. Больш за тое, нам удалося дасягнуць дамоўленасці па шасці прыярытэтных кірунках навукова-тэхналагічнага і інавацыйнага супрацоўніцтва».

Закраналіся падчас форуму і іншыя пытанні (якія канкрэтна, можна пачытаць на наступных старонках выпуску). Ёсць канкрэтныя вынікі і яны паказваюць, як, нягледзячы на санкцыі, можна і трэба ўзаемадзейнічаць, выконваючы баланс інтарэсаў ва ўсіх сферах.

Наступны Форум рэгіёнаў адбудзецца ва Уфе (Рэспубліка Башкартастан).

Вераніка КАНЮТА.

ЗАМЯШЧЭННЕ ІМПАРТУ — ТЭМА НУМАР АДЗІН

На Форуме рэгіёнаў абмеркавалі стан і перспектывы імпартазамяшчэння ў рамках Саюзнай дзяржавы ва ўмовах санкцый

На пасяджэнні адпаведнай секцыі адзначалася, што сфера імпартазамяшчэння мае нямала праблемных пытанняў. У іх абмеркаванні ўзяло ўдзел каля 70 чалавек з ліку прадстаўнікоў дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання, банкаў, камерцыйных кампаній, грамадскіх аб'яднанняў, інтэграцыйных структур Беларусі і Расіі. Спікеры акрэслілі важнасць адаптацыі эканомікі Саюзнай дзяржавы да новых рэалій і выказалі неабходнасць у зняцці бар'ераў для лепшай работы па замяшчэнні імпарту.

Санкцыі з боку Захаду вымушаюць Беларусь і Расію актыўна працаваць у сферы імпартазамяшчэння. Аб гэтым заявіў **намеснік старшыні Камітэта Савета Федэрацыі па эканамічнай палітыцы Іван АБРАМАЎ.**

Ён заўважыў, што Расія стала сусветным лідарам па колькасці ўведзеных супраць яе санкцый. Гэта вымушае адаптацыі планаў па імпартазамяшчэнні ў новай рэальнасці. Напрыклад, цяпер у Расіі аддаецца ўвага вытворчасці сыравіны і камплектуючага абсталявання, у якіх краіна мае патрэбу. Падрыхтаваны прапановы па арганізацыі вытворчасці імпартазамяшчальнай прадукцыі больш чым на 220 пляцоўках. Як падкрэсліў расійскі спікер, Беларусь таксама знаходзіцца пад дзеяннем жорсткіх санкцый калектыўнага Захаду. І гэта вымушае яе актыўна працаваць у рэчышчы імпартазамяшчэння.

— У сучасны момант ідзе работа па перазагрузцы кааперацыі Расіі і Беларусі, — адзначыў Іван Абрамаў. — Патэнцыял беларускай эканомікі мае ўсе магчымасці для імпартазамяшчэння неабходных расійскай эканоміцы тавараў і паслуг. Адным з найбольш перспектыўных напрамкаў з'яўляюцца інфармацыйныя тэхналогіі. Акрамя таго, створана сем галіновых груп для забеспячэння імпартазамяшчэння ў сферы лёгкай, хімічнай прамысловасці, электронікі і іншых кірункаў. Ідзе работа па стварэнні электронай пляцоўкі, дзе прадпрыемствы змогуць падбіраць партнёраў.

Расійскі бок нават прыняў план першачарговых дзеянняў па забеспячэнні развіцця эканомікі ва ўмовах знешняга санкцыйнага ціску, які на рэгулярнай аснове дапаўняецца новымі мерапрыемствамі. Яны скіраваны на прадастаўленне льгот імпартазамяшчальнай вытворчасці.

— Мы радыкальна скарацілі кантрольна-наглядную дзейнасць, аўтаматычна працягваем ліцэнзіі, дазволы, спрошчаны працэдуры пацвярджэння адпаведнасці. Зняты многія іншыя бар'еры на шляху імпарту, спрошчаны бюджэтныя працэдуры. Ажыццяўляюцца праграмы падтрымкі некаторых галін — транспарту, АПК, прамысловасці, ІТ-галіны. Актыўна ідзе выдача льготнага крэдытавання ў рамках праграм. Усе гэтыя меры дазволілі захаваць устойлівасць фінансавага і валютнага рынкаў, стабілізаваць сітуацыю ў эканоміцы, — паведаміў прадстаўнік расійскага парламента. — У сваю чаргу, форум — тая пляцоўка, якая дазваляе падзяліцца вопытам і выпрацаваць канкрэтныя меры па зверцы нашых крокаў.

Абарона знешняга рынку немагчымая без каардынацыі работы ў сферы імпартазамяшчэння Саюзнай дзяржавы, лічыць **першы намеснік міністра эканомікі Беларусі Юрый ЧАБАТАР.** Ён акцэнтаваў увагу на патэнцыяле імпартазамяшчэння. Па яго словах, патэнцыял даволі шырокі і складае да 60 млрд долараў. Для Беларусі цана пытання — каля 5 млрд. Для краіны ключавой з'яўляецца вытворчасць рухавікоў, лакаматываў, чыгуначных вагонаў. У Расіі ёсць патрэба ў транспартных сродках, абсталяванні для сельскай гаспадаркі. І галоўны напрамак — новыя вытворчасці.

— Цяпер мы працуем над адпаведнымі дамоўленасцямі, пакуль ёсць напрацоўкі па 10 праектах, і работа працягваецца. Асаблівы акцэнт на тыя вытворчыя аб'екты, якія будуць мець сінергетычны эфект, — падкрэсліў Юрый Чабатар. А яго калега, **намеснік міністра эканамічнага развіцця Расійскай Федэрацыі Дзмітрый ВОЛЬВАЧ,** упэўнены, што ў энергетычнай сферы абодвум бакам неабходна распрацаваць пагадненне аб аб'яднанні рынкаў газу, нафты, электраэнергіі. Гэта дазволіць стварыць роўныя ўмовы для гаспадарчых суб'ектаў і ў перспектыве — запусціць адзіныя прынцыпы цэнаўтварэння. Між тым, пытанне не такое простае.

Адна з праграм накіравана на фарміраванне адзінай прамысловай палітыкі Саюзнай дзяржавы. Па словах **намесніка дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы Уладзіміра АМАРЫНА,** работа міністэрствам дзвюх краін скіравана на тое, каб максімальна задзейнічаць сумесны патэнцыял па замяшчэнні імпартных паставак, якіх не стала. У сувязі з гэтым на працягу апошняга перыяду на пасяджэнні рабочых груп Саюзнай дзяржавы актыўна разглядаліся пытанні па імпартазамяшчэнні. У іх ліку — развіццё мікраэлектронных тэхналогій у прамысловасці, у прыватнасці, электроннага машынабудавання, развіццё агульнага біржавога гандлю. У полі зроку таксама — пытанні ўзаемапрызнання банкаўскіх гарантый пры дзяржзакупках.

Найбольш значныя праграмы фінансуюцца з саюзнага бюджэту. Сярод іх — праект па стварэнні новых спінальных сістэм, якія накіраваны на замяшчэнне імпартнага і стварэнне ўнікальнага абсталявання і тэхналогій у сельскай гаспадарцы і медыцыне. Напрыклад, сёлета пачнецца рэалізацыя трох новых праграм, арыентаваных на імпартазамяшчэнне ў галінах мікраэлектронікі, у тым ліку сістэм для дапамогі кіроўцам. Напрыклад, стварэнне прадуктаў фатонікі — высакаскорасных прылад апрацоўкі аптычных сігналаў, якія не саступаюць па ўзроўню сусветным аналагам. Касмічная праграма скіравана на стварэнне нанаспадарожнікаў маламернага эксперыментальнага ўзору для маніторынгу над атмасферай.

Налета плануецца распачаць фінансаванне яшчэ дзвюх праграм, адна з якіх датычыцца сферы АПК і дазволіць распрацаваць сучасныя рэцэптуры новых кармавых дабавак камбікармоў і інавацыйнага абсталявання для сельскагаспадарчых жывёл. На перспектыву разглядаецца праграма па распрацоўцы кампанентаў для сонечнай энергетыкі. Мэта праграмы — пераадолець тэхнічнае адставанне ад сусветных аналагаў. Каб паскорыць іх рэалізацыю, вядзецца работа па спрашчэнні і дэбюракратызацыі самога працэсу распрацоўкі праграм Саюзнай дзяржавы. Адзначалася, што перыяд падрыхтоўкі павінен складаць не больш чым 12 месяцаў.

Менавіта сумесныя праекты — той інструмент, які садзейнічае працэсу імпартазамяшчэння. На гэта скіравана і работа чарговага IX Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Прагрэс тут відавочны. Напрыклад, сума камерцыйных кантрактаў на ім дасягнула 65 млрд расійскіх рублёў, ці 1,2 млрд долараў ЗША. Геаграфія кантрактаў даволі шырокая. Калі раней пераважалі Масква, Санкт-Пецярбург, Смаленск, цяпер выходзяць на падпісанне кантрактаў з далёкаўсходнімі рэгіёнамі.

— Мы разумеем, што свет ужо не стане такім, як быў, таму важна выйсці з глабальнай трансфармацыі мацнейшымі і больш эфектыўнымі, — выказала меркаванне **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ.** — Разам з тым, Расія і Беларусь прыйшлі да неабходнага руху ў эканоміцы задоўга да цяперашняй сітуацыі. Пацвярджэнне таму — 28 саюзных праграм. Мэта гэтых праграм — зблізіць эканомікі нашых краін, прывесці да павелічэння тавараабароту.

Па словах беларускага парламентарыя, тавараабарот з Расіяй з году ў год расце. За 2021-ы ён склаў каля 40 мільярдаў долараў, што на 35 % больш, чым у папярэднім 2020-м. За першы квартал бягучага года паказчык склаў каля 14 мільярдаў долараў. І гэта таксама значна больш, чым летась.

— Сапраўды, расійскі бок праяўляе цікавасць да беларускай лёгкай прамысловасці, — звярнула ўвагу **ўдзельніца секцыі, старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна ЛУГІНА.** — Калі раней мы больш прысутнічалі на блізкіх тэрыторыях, а за Уралам наша прысутнасць была ніжэйшая — сёлета ёсць верагоднасць адкрыцця ў далёкіх расійскіх рэгіёнах аптовых пунктаў нашага канцэрну. Многія расіяне хочуць бачыць у сябе якасную беларускую прадукцыю. У нас у гэтым напрамку добра развіваецца дызайнерская ініцыятыва, сярэдні бізнес, можна набыць эксклюзіўнае адзенне, хоць яно і даражэйшае. Сёння створаны ўсе ўмовы для развіцця рынку лёгкай прамысловасці. Папулярныя такія брэнды, як «Элема», «Галантэя», з поспехам выходзіць на расійскі рынак прадпрыемства «Калінка», плануецца адкрыццё некалькіх крамаў прадпрыемства «Світанак» у Санкт-Пецярбургу. Добры попыт мае беларускі абутак — гэта таксама наш трэнд. Як вядома, Беларусь выпускае абутак з натуральнай скуры, а не кожная краіна можа гэтым пахваліцца. Цяпер мы адпрацоўваем магчымасці супрацоўніцтва з Арэнбургскім рэгіёнам, расійская дэлегацыя наведала Аршанскі льнокамбінат, Камвольны камбінат і ААТ «Магатэкс». І на кожным прадпрыемстве робяцца заяўкі на нашы тавары.

Разам з тым, ёсць неабходнасць прызнання на расійскім рынку агульных правоў па таварных пазіцыях. Эканомікі павінны быць у роўных прававых умовах, лічыць кіраўнік «Беллегпрама», тады і інтэграцыйныя працэсы пойдуць хутчэй. Дзякуючы форуму можна надаць імпульс таму ці іншаму міністэрству.

Расіяне пагаджаюцца: попыт на беларускую прадукцыю расце. Напрыклад, за чатыры месяцы гэтага года назіраецца рост гандлю на 12 % у параўнанні з мінулагоднім перыядам. Павялічыліся закупкі беларускіх цэлюлозна-папяровых вырабаў, прадукцыі хімічнай вытворчасці і транспартных сродкаў, харчовых тавараў. З Расіі ідзе больш сельскагаспадарчай сыравіны, металу. Летась Беларусь заняла другое месца па агульным аб'ёме тавараабароту з Маскоўскай вобласцю. Дзейнічае каля 170 пагадненняў з 70 суб'ектамі Расіі. Як адзначалася падчас форуму, з сакавіка бягучага года праходзяць рэгулярныя сустрэчы эканамічных ведамстваў дзвюх краін, каля 70 расійскіх рэгіёнаў ужо прадставілі пералік тавараў, якія яны хацелі б закупляць у беларускіх абласцях. За апошнія тры месяцы заключана каля 400 кантрактаў з беларускімі партнёрамі з удзелам 25 суб'ектаў гаспадарання Расіі на суму каля 10 млрд рублёў. Асаблівы інтарэс назіраецца ў размяшчэнні зборачных прадпрыемстваў беларускай сельскагаспадарчай і грузавой тэхнікі.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

АБ'ЯДНАЎ... ПАМІДОР

У Гродне ў рамках IX Форуму рэгіёнаў падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж беларускім Іўем і расійскім Мінусінскам

Рэгіёны маюць добрыя напрацоўкі ў сельскагаспадарчай вытворчасці, у прыватнасці, у вырошчванні памідораў. Абодва гарады па праве заваявалі статус памідорных сталіц у сваіх краінах.

Менавіта на гэты фактар звярнуў увагу падчас падпісання дагавора **кіраўнік Мінусінска Андрэй ПЯРВУХІН.** Ён адзначыў, што горад — сталіца паўднёвай тэрыторыі Краснаярскага краю, аграпрамысловы рэгіён, з вялікім аб'ёмам перапрацоўкі. Гэтаму спрыяюць кліматычныя ўмовы — больш за 250 сонечных дзён у годзе.

Асабліва значных вынікаў горад дасягнуў у вырошчванні памідораў, якія прызнаныя рэкардсменамі ў Расіі. Памідор-гігант вагой 2 кг 260 грамаў занесены ў расійскую кнігу рэкордаў. Дарэчы, вырас ён у адкрытым грунце.

— Паколькі горад Іўе Гродзенскай вобласці таксама лічыцца памідорнай сталіцай сваёй краіны, гэта нас і аб'яднала. Знайшлі мы адно аднаго ў інтэрнэце. Завязалася перапіска, мы ўбачылі, што ёсць шырокія перспектывы для супрацоўніцтва. Напрыклад, мы можам падзяліцца насенням, магчыма, і тут у хуткім часе з'явяцца такія памідоры-гіганты, — заўважыў Андрэй Пярвухін.

На яго думку, у абодвух гарадоў шмат агульных інтарэсаў. Гэта і тэхнічнае абсталяванне, і тэхналогіі вырошчвання гародніны, і абмен кваліфікаванымі спецыялістамі. Кіраўнік расійскага горада дадаў, што ў іх ёсць патрэба ў кадрах.

«Памідорная» тэма — гэта толькі пачатак супрацоўніцтва, лічыць **старшыня Іўеўскага райвыканкама Ігар ГЕНЕЦ.** Між тым, раён таксама мае пэўныя напрацоўкі ў дадзеным кірунку. Менавіта тут вырас самы вялікі ў Беларусі памідор, вагой амаль паўтара кілаграма. Некалькі гадоў запар тут праходзіць папулярнае свята — Дзень памідора. Сёлета яно адбудзецца 19 жніўня. Дарэчы, такі ж фестываль стаў традыцыйным і ў Мінусінску.

— Вельмі важна, што мы знайшлі адно аднаго, хоць нас падзяляюць тысячы кіламетраў. Але гэта не стане перашкодай для супрацоўніцтва. З такіх кантактаў і складаецца будучыня нашых дзяржаў, — падкрэсліў падчас сустрэчы Ігар Генец.

Абодва бакі бачаць сваё супрацоўніцтва ў больш шырокім ракурсе. Гэта не толькі эканоміка, але і культурныя, спартыўныя сувязі. Мэр Мінусінска паведаміў, што налета горад будзе адзначаць 200-годдзе, і запрасіў сваіх новых сяброў-пабрацімаў на свята.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

НОВЫЯ ВЕКТАРЫ КЛІМАТЫЧНАЙ ПАЛІТЫКІ

Экалагічныя праблемы апошнім часам выкарыстоўваюцца ў якасці інструменту маніпулявання

Падчас секцыі «Супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ва ўмовах новай міжнароднай кліматычнай павесткі», якая адбылася падчас Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, былі выпрацаваны прапановы па развіцці ўзаемадзеяння дзвюх краін у галіне аховы навакольнага асяроддзя і сацыяльна-эканамічнага развіцця ва ўмовах змянення клімату. Інтэграцыйныя падыходы па гарманізацыі падыходаў у вырашэнні прыродаахоўных і кліматычных пытанняў набываюць асаблівае гучанне ў няпростай міжнароднай палітычнай і эканамічнай сітуацыі.

Прававое рэгуляванне

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ адзначыў, што змяненне клімату ўваходзіць у лік ключавых глабальных праблем, якія ставяць нацыянальныя эканомікі перад сур'ёзнымі выклікамі. «Справіцца з імі магчыма з дапамогай стварэння ўмоў для развіцця і выкарыстання зялёных тэхналогій і эканомікі замкнёнага цыкла, — перакананы сенатар. — Істотнай умовай для пераадолення такога глабальнага выкліку сучаснасці з'яўляецца стварэнне справядлівых і прымальных, у тым ліку для краін з сярэднім узроўнем даходу, крытэрыяў доступу да міжнародных кліматычных фінансавых механізмаў і рэсурсаў».

Пры гэтым, па словах парламентарыя, кліматычнае рэгуляванне неабходна зрабіць кампрамісным, улічваючы інтарэсы і ўзровень развіцця розных краін. Па лініі зялёнай павесткі выпрацавана прававая аснова ўзаемадзеяння Беларусі і Расіі, створаны і функцыянуюць сучасныя інструменты двухбаковага супрацоўніцтва, ажыццяўляецца сумесны ўдзел у міжнародных экалагічных і прыродаахоўных механізмах. У той жа час вырашэнне актуальных праблем у сферы адаптацыі да змяненняў клімату абумоўлівае падрыхтоўку канцэптуальна новай тэарэтычнай асновы, гарманізацыю адпаведных прававых патрабаванняў у межах Саюзнай дзяржавы, унясенне неабходных змяненняў у нацыянальнае заканадаўства Беларусі і Расіі.

Фактар стрымлівання і абмежавання

Удзельнікі секцыі зрабілі акцэнт на рэалізацыі Беларуссю і Расіяй Парыжскага пагаднення па клімаце, змякчэнні наступстваў змяненняў клімату і адаптацыі да іх ва ўмовах няпростай міжнароднай і эканамічнай абстаноўкі. Як канстатаваў **старшыня Камітэта Савета Федэрацыі па міжнародных справах Рыгор КАРАСІН,** у сітуацыі, калі беспрэцэдэнтна парушаюцца агульнапрызнаныя нормы міжнароднага права, ідзе франтальная атака супраць Расіі і Беларусі, кліматычная павестка можа стаць яшчэ адным фактарам стрымлівання і абмежавання магчымасцяў нашага развіцця на міжнародных рынках. «Таму пакідаць без увагі кліматычную павестку было б сур'ёзнай памылкай, — перакананы ён. — Мы павінны рухацца наперад. У сістэме дзеючых так званых правілаў, створанай нашымі апанентамі, мы знаходзімся ва ўразлівай пазіцыі. Адзіны правільны шлях — дамагацца лідарства, ініцыятывы ў сусветнай кліматычнай павестцы, фарміруючы новыя сэнсы ва ўмовах узаемадзеяння».

Таксама эксперт папярэдзіў, што кліматычная павестка будзе выкарыстоўвацца для аказання эканамічнага і палітычнага ціску, абмежавання доступу расійскай і беларускай прадукцыі на сусветны рынак. «Патрэбна выбраць актыўную стратэгію, якая дазволіць Беларусі і Расіі самастойна выбіраць шляхі дасягнення мэт па зніжэнні канцэнтрацыі парніковых газаў у атмасферы, пры гэтым захоўваючы сваю эканоміку, умацоўваючы свае магчымасці і ўлічваючы інтарэсы ўласных грамадзян, — рэзюмаваў старшыня Камітэта Савета Федэрацыі па міжнародных справах. — У гэтым выпадку мы павінны фарміраваць уласны план работы і сваё бачанне сусветнай кліматычнай тэмы. Неабходныя механізмы для гэтага ёсць як у межах Саюзнай дзяржавы, так і Еўразійскага эканамічнага саюза».

Экалагічная бяспека

— Кліматычная палітыка, экалагічная бяспека, зялёная, цыркулярная эканоміка, захаванне біялагічнай разнастайнасці — усе гэтыя пытанні ў апошнія гады сталі прадметам прававога рэгулявання ў нашых краінах, — падкрэсліў **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Андрэй ХУДЫК.** — У Беларусі ў мэтах забеспячэння нацыянальных экалагічных інтарэсаў прыняты і рэалізоўваецца шэраг стратэгічных дакументаў. Адным з найбольш важных кірункаў супрацоўніцтва Беларусі і Расіі з'яўляецца дасягненне кліматычных амбіцый 2030 і 2050 гг., падрыхтоўка сумеснай дарожнай карты па вугляродным рэгуляванні.

У прыватнасці, у верасні 2021 года ўрадам Беларусі зацверджаны новы план, у адпаведнасці з якім да 2030 года плануецца скараціць выкіды парніковых газаў на 30 % да ўзроўню 1990 года. Свой уклад у распрацоўку і рэалізацыю галіновых і рэгіянальных планаў адаптацыі Саюзнай дзяржавы да змяненняў клімату ўнясе рэалізацыя мерапрыемстваў у рамках праграмы Саюзнай дзяржавы «Аб забеспячэнні гідраметэаралагічнай бяспекі ва ўмовах зменлівасці і змянення клімату на 2023 — 2027 гады». Яе вынікі дазволяць забяспечыць зніжэнне страт ад уздзеяння негатыўных кліматычных змяненняў для насельніцтва і эканомікі Саюзнай дзяржавы, а таксама ацаніць новыя магчымасці, якія адкрываюцца са змяненнем клімату ў будучыні.

Яшчэ адзін важны кірунак узаемадзеяння — павышэнне эфектыўнасці выкарыстання водна-рэсурснага патэнцыялу. «Рэспубліка Беларусь, як і Расійская Федэрацыя, маюць дастаткова высокі ўзровень урбанізацыі, а адпаведна, падобныя праблемы са станам водных рэсурсаў на гарадскіх тэрыторыях, — заўважыў Андрэй Худык. — Найбольш уразлівымі да кліматычных змяненняў з'яўляюцца малыя вадацёкі і малыя вадаёмы, а таксама крыніцы, якія маюць высокае экалагічнае горадабудаўнічае і электрыфікацыйнае значэнне. Мяркуем, што аб'яднанне намаганняў расійскіх і беларускіх вучоных у рамках праграмы Саюзнай дзяржавы дазволіла б вызначыць навукова абгрунтаваныя падыходы да аднаўлення водных аб'ектаў, правесці комплексную ацэнку іх экалагічнага стану, а таксама распрацаваць комплекс мер па аднаўленні і рэабілітацыі водных аб'ектаў асобных гарадоў як Расіі, так і Беларусі».

Як перакананы **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і экалогіі Расіі Сяргей АНАПРЫЕНКА,** паміж нашымі краінамі закладзены вялізны патэнцыял узаемавыгаднага супрацоўніцтва, заснаванага на гістарычна дружалюбных адносінах, праверaных гадамі. «Расія і Беларусь узаемадзейнічае па цэлым шэрагу кірункаў, у тым ліку ў прыродаахоўнай сферы, — удакладніў ён. — Нашай агульнай задачай з'яўляецца рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў, недапушчэнне незваротных наступстваў для навакольнага асяроддзя і здароўя чалавека. Расійская Федэрацыя і Рэспубліка Беларусь прымаюць істотныя меры па барацьбе са змяненнямі клімату, зніжэнні ўздзеяння на навакольнае асяроддзе шматлікіх фактараў прыроднага і тэхнагеннага характару».

Пацвярджэнне гэтаму — шэраг стратэгічных дакументаў, накіраваных на выкананне міжнародных абавязацельстваў, забеспячэнне нацыянальнай бяспекі, рэагаванне на асноўныя экалагічныя выклікі і пагрозы. Да іх дабавіліся падпісаныя падчас форуму мемарандум аб узаемаразуменні па пытаннях супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя паміж Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі і адміністрацыяй Томскай вобласці, пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам «Цэнтральны навукова-даследчы інстытут комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў» і Федэральнай дзяржаўнай бюджэтнай адукацыйнай установай вышэйшай адукацыі «Расійскі дзяржаўны гідраметэаралагічны ўніверсітэт» і іншае.

Спецыялістамі ў сферы навакольнага асяроддзя таксама былі выпрацаваны прапановы па ўдасканаленні стратэгіі Беларусі і Расіі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і сацыяльна-эканамічнага развіцця ва ўмовах новай кліматычнай павесткі.

Вераніка КАНЮТА.

ІНТЭГРАЦЫЯ Ў АДУКАЦЫІ

Навуковы патэнцыял дзвюх краін будзе выкарыстоўвацца больш актыўна

Вынікамі пасяджэння секцыі № 5 па тэме «Інтэграцыя сістэмы вышэйшай адукацыі Расіі і Беларусі: рэгіянальны аспект» стала падпісанне новых пагадненняў і ўмацаванне ўжо існуючых. Знойдзены новыя партнёры, прапрацаваны шляхі ўзаемадзеяння і абмену напрацоўкамі. У абмеркаваннях будучых механізмаў супрацоўніцтва ўзяло ўдзел каля 80 спецыялістаў у галіне вышэйшай адукацыі. Некаторыя ВНУ выйшлі на сувязь у фармаце анлайн. На думку ўдзельнікаў, адбыўся высокаканструктыўны дыялог навуковых колаў на прадмет абагульнення найлепшых дасягненняў у навуцы і адукацыі.

— Беларусь і Расія ажыццяўляюць цеснае і ўзаемавыгаднае акадэмічнае і культурнае супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы на аснове агульнай гістарычнай спадчыны, — падкрэсліў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, рэктар Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, мадэратар секцыі з беларускага боку Алег ДЗЯЧЭНКА.** — Такое супрацоўніцтва з'яўляецца гарантам устойлівага, эфектыўнага сацыяльна-эканамічнага развіцця і навукова-тэхнічнага прагрэсу Саюзнай дзяржавы, спрыяе

фактарам захавання і паглыблення дружалюбных адносін паміж народамі дзвюх краін. Удзельнікі пасяджэння выказаліся за неабходнасць далейшай інтэграцыі нацыянальных сістэм вышэйшай адукацыі і фарміраванне адзінай адукацыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы. Гэта будзе садзейнічаць гарманічнаму і ўсебаковаму выхаванню юнакоў і дзяўчат, фарміраваць у іх агульную высокапатрыятычную свядомасць, што дапаможа эфектыўна супрацьдзейнічаць спробам фальсіфікаваць факты гісторыі.

Падчас работы секцыі было падпісана 17 пагадненняў, з іх шэсць у рэжыме анлайн. Некалькі сур'ёзных праектаў будуць развіваць магілёўскі Беларуска-Расійскі ўніверсітэт і дзве вышэйшыя ўстановы Санкт-Пецярбурга — аграрны і політэхнічны ўніверсітэты. З апошнім, напрыклад, падпісаны Дагавор аб рэалізацыі адукацыйнай праграмы ў сферы наземных транспартна-тэхналагічных комплексаў і замежнага рэгіёнаазнаўства.

Алег Дзячэнка адзначыў, што падчас работы секцыі быў выпрацаваны пералік неабходных мер, якія плануецца рэалізаваць сумесна з Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы да 2025 года. Гэта забеспячэнне пашыранага міжуніверсітэцкага супрацоўніцтва для нарошчвання патэнцыялу ў адукацыйнай, навуковай і інавацыйнай сферах; удасканаленне практык сумесных адукацыйных праграм з магчымасцю выдачы студэнтам двух дыпломаў па найбольш запатрабаваных спецыяльнасцях вышэйшай адукацыі; пашырэнне практыкі павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў, спецыялістаў, педагагічных кадраў ва ўстановах дадатковай адукацыі і адукацыйных цэнтрах Беларусі і Расіі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. **Нумар падпісаны ў 19.30 5 ліпеня 2022 года.**

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении аукциона

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-159346 (назначение – здание многофункциональное, наименование – здание административно-торгового и общественного питания), площадью 1 564,50 кв. м, г. Гродно, ш. Озерское, 43 и пожарная сигнализация ГР0000253.
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 440100000001008366, площадью 0,1170 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания многофункционального), расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 43.
Начальная цена продажи – 864 270,60 руб. (восемьсот шестьдесят четыре тысячи двести семьдесят рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 86 527 руб. (восемьдесят шесть тысяч пятьсот двадцать семь рублей).
Продавец – Гродненский городской филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 8-0152-52-02-88.
Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70.
Условия проведения аукциона: оплату за приобретаемый объект производить путем перечисления денежных средств на расчетный счет Продавца, а также иными способами, не противоречащими действующему законодательству Республики Беларусь; расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возлагаются на Покупателя; право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи.
Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.

Номер р/с для перечисления задатка – BY44-BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 8 августа 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник–четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.

Последний день приема заявлений – 4 августа 2022 г. до 15.00

Телефон для справок 55-87-71– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Автотранcsстрой»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Кап. строение с инв. № 630/С-79467 (назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства; наименование – автозаправочный пункт, общая площадь – 8,9 кв. м)	125 250,00	12 525,00	6262,50

В отношении лота проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 25 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 86 (29708) от 05.05.2022, стр. 14, № 117 (29739) от 17.06.2022, стр. 14.

Местонахождение лота № 1: Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 2/5.
Лот расположен на земельном участке с кадастровым номером 624000000003000030, площадью 4,4255 га, для обслуживания и эксплуатации производственной базы. Право аренды продавца (79/100 доли).

Ограничения (обременения)	Аренда открытой площадки с бетонным покрытием (является составным элементом автозаправочного пункта) для осуществления хозяйственной и иной деятельности до 14.11.2025
Дата и время проведения торгов	**19 июля 2022 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	С 10.00 06 июля 2022 года до 16.00 15 июля 2022 года

Условия для участия в торгах: 1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту 1, ОАО «Автотранcстрой», проводимых 19.07.2022.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов **– Александр Николаевич, +375292627504.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет.

Информация о продавце	ОАО «Автотранcстрой» в лице ликвидатора – ООО «Центр антикризисных проектов», тел. 80172552928; +375293489225 (Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, д. 2, УНП 600077182)
Организатор аукциона	ООО «Фрондера» 220113 г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 28 июля 2022 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование лотов	Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20 %)	Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20 %)
1	**Помещение площадью 19,1 кв. м** в изолированном помещении – помещение связи с инв. № 340/D–213112, помещение на 4-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент месторасположения – 1.0. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66-2	**80,70**	80,70
2	**Помещение площадью 12,3 кв. м** в изолированном помещении – помещение связи с инв. № 340/D–213112, помещение на 4-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент месторасположения – 1.0. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66-2	**51,97**	51,97
3	**Помещение площадью 16,74 кв. м** в капитальном строении – гараж с ремонтными мастерскими с инв. № 350/С–37540, помещение на 1-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,3. Коэффициент месторасположения – 0,9. **Адрес:** г. Гомель, пр. Речицкий, 9А	**70,73**	70,73
4	**Помещение площадью 16,62 кв. м** в капитальном строении – гараж с ремонтными мастерскими с инв. № 350/С–37540, помещение на 1-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,3. Коэффициент месторасположения – 0,9. **Адрес:** г. Гомель, пр. Речицкий, 9А	**70,22**	70,22

Сведения о продавце	Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8 (0232) 79-69-76
Срок подачи заявления	**с 06.07.2022 г. по 26.07.2022 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга». Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения
Номер р/с для перечисления задатка	р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, в ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, **получатель – Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»,** назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)
Условия пользования	для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организация производства (кроме вредных производств)
Размер штрафа	Лоты №№ 1, 3, 4 – по 2 (две) базовых величины, лот № 2 – 1 (одна) базовая величина – согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги от условий проведения аукционных торгов, согласно действующему законодательству)

Срок договора аренды – 5 (пять) лет, шаг аукциона – 10 (десять) %. К участию допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица. Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и предоставить необходимые документы: юридическим или физическим лицом, а также индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий, полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов, ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения, за вычетом внесенной им суммы задатка. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии Положения «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049 (изм. от 14.08.2021 № 465). **Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»);** государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by/ в** разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база». **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19 – Алеся Станиславовна, 8 (029)126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз» (продавец) извещает о проведении 19 июля 2022 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена продажи с НДС, бел. руб.	Задаток (10 %) с НДС, бел. руб.
	Местонахождение имущества: Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42		
1	Краситель белый (White Masterbatch) 0247А, код 0000024366, 1415,74567 кг	2 880,00	288,00
2	Краситель коричневый (ромбест)78131, код 0000011898, 100 кг	300,00	30,00
3	КРАСИТЕЛЬ КРСНЫЙ СКГП 101 ПО 1123, код 0000001521, 3 кг	8,40	0,84
4	Краситель СКГП-401 ПО 4369 зеленый, код 0000001044, 24,6 кг	99,60	9,96
5	Краска, код 0000008917, 9520,07501 кг	171 600,00	17 160,00
6	КРАСКА UV-P 300 РЕФЛЕКС СИНИЙ, код 0000001595, 2 кг	36,00	3,60
7	КРАСКА UV-Z 2350 ЗЕЛЕН., код 0000001600, 3 кг	54,00	5,40
8	КРАСКА UV-Z2201 КРАСНАЯ, код 0000010890, 12 кг	21 600	21,60
9	КРАСКА UV-P 201 КРАСНАЯ, код 0000001604, 9 кг	156,00	15,60
10	КРАСКА UV-P 203 РОДОМИН, код 0000001606, 9 кг	156,00	15,60
11	КРАСКА UV-P250 пантон пурпурный, код 0000023756, 1 кг	18,00	1,80
12	КРАСКА UV-X 40003 ЧЕРНАЯ, код 0000001609, 4 кг	7200	7,20
13	КРАСКА ОРАНЖЕВАЯ UV-Z 2150, код 0000010888, 9 кг	156,00	15,60
14	Краска 072 голубая UV-P302, код 0000014370, 4 кг	72,00	7,20
15	Краска POS SUPERIOR R SLOW пантон 356С, код 0000016945, 20 кг	372,00	37,20
16	Краска POS SUPERIOR R SLOW пантон 194С, код 0000016645, 60 кг	1 188,00	118,80
17	Краска POS SUPERIOR R SLOW пантон 3425С, код 0000016747, 40 кг	756,00	75,60
18	Краска POS SUPERIOR SR SLOW пантон 2728С, код 0000016208, 20 кг	336,00	33,60
19	КРАСКА RV X60001 ПРОЗРАЧНАЯ, код 0000001630, 20 кг	288,00	28,80
20	Краска RV-Z2202 пурпурный, код 0000022537, 20 кг	432,00	43,20
21	Краска для флексографской и глубокой печати POS STANDART FL оранжевый 121, код 0000022187, 20 кг	384,00	38,40
22	Краска для флексографской и глубокой печати POS STANDART FL пантон 186, код 0000022213, 20 кг	408,00	40,80
23	Краска для флексографской и глубокой печати POS STANDART FL родамин красный 269, код 0000022205, 20 кг	408,00	40,80
24	Краска для флексографской и глубокой печати POS STANDART FL фиолетовый 023, код 0000022208, 20 кг	408,00	40,80
25	Краска для флексографской и глубокой печати POS SUPERIOR SR HLR пантон 265, код 0000022335, 40 кг	804,00	80,40
26	Краска для флексографской и глубокой печати pos superior sr mlr пантон 1797С, код 0000020936, 80 кг	1 560,0	156,00
27	Краска для флексографской и глубокой печати UNI SUPERIOR FL процесс циан 153, код 0000022180, 20 кг	336,00	33,60
28	Краска для флексографской печати POS SUPERIOR SR HLR 208, код 0000024886, 20 кг	384,00	38,40
29	Краска для флексографской печати POS SUPERIOR SR MLR 137, код 0000024885, 120 кг	2 280,00	228,00
30	Краска для флексографской печати POS SUPERIOR SR MLR пантон 2129С, код 0000021483, 40 кг	672,00	67,20
31	Краска для флексографской печати POS SUPERIOR SR MLRпантон 265 С, код 0000021385, 80 кг	1 560,00	156,00
32	Краска красная 032 2832, код 0000022015, 20 кг	408,00	40,80
33	Краска красная 032 RV-P201 полиграфическая ROLID, код 0000009374, 16 кг	324,00	32,40
34	Краска красная 1120R, код 0000024979, 20 кг	408,00	40,80
35	Краска красный 485, код 0000024913, 40 кг	804,00	80,40
36	Краска оранжевая 021/3743, код 0000010870, 20 кг	384,00	38,40
37	Краска Прозрачная 0016, код 0000024681, 20 кг	288,00	28,80
38	Краска прозрачная 0901 Mod, код 0000024943, 40 кг	564,00	56,40
39	КРАСКА ФИОЛЕТОВАЯ UV- Z2250 (35007), код 0000001667, 2 кг	36,00	3,60
40	Краска черная /8110, код 0000010871, 40 кг	672,00	67,20
41	Краска черная 1374, код 0000025132, 20 кг	336,00	33,60

Продавец ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз», Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42 . Контактный телефон +375 29 655 50 51.
Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.
Для участия в аукционе необходимо: 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB301213226 50030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**
2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 18.07.2022 г. в 17.00.**
С предметом аукциона можно ознакомиться каждую пятницу по предварительному согласованию с ликвидатором.
Для участия в аукционе предоставляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом (ИП) РБ – копии свидетельства о государственной регистрации юр. лица (ИП), устава юр. лица; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность; представителем физ. лица (ИП) РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, физ. лица, ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет 31, 32, 33 стр. паспорта, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.
Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение 10 (десяти) рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

Пласты гісторыі

ГРАБНІЦЫ З ВАЯРАМІ І КОНЬМІ

Археолагі раскапалі пахаванне старажытнага клана ў Кітаі

У правінцыі Хэнань знайшлі маштабны комплекс грабніц часоў позняй дынастыі Шан (1600 — 1046 гг. да н. э.). Археолагі раскапалі 18 падмуркаў будынкаў, 24 грабніцы, чатыры пахавальныя ямы. Раскопкі вяліся больш за два гады.

У ямах знайшлі шэсць вазоў і некалькі воінаў з коньмі. На некаторых ваярах былі надзеты капелюшы, упрыгожаныя ракавінамі. Разам з тым, некаторыя з буйных магільняў былі ўжо разрабаваныя, у іх засталася толькі невялікая колькасць керамікі, а таксама шкілеты людзей і коней.

Мяркуецца, што на месцы раскопак жыў шматлікі клан Цэ дынастыі Шан. Сярод надпісаў на знойдзеным бронзавым посудзе знайшлі кітайскі іерогліф «цэ», які паказвае на прыналежнасць да клана.

Даследчыкі выявілі мноства артэфактаў, сярод якіх — аб'екты з нефрыту і каменю, вырабы з косці і ракавін малюскаў. Рэлікві вельмі разнастайныя і адносна добра захаваліся.

На думку археолагаў, гэтая знаходка вылучаецца сярод іншых археалагічных адкрыццяў, бо адлюстроўвае выключны статус і ўладу, якой валодалі пахаваныя там людзі.

Каго мы бачым!

ХІМЕРА З ГЛЫБІНЬ

У Новай Зеландыі злавілі рэдкае дзіцяня акулы-прывіду

Тамтэйшыя навукоўцы зрабілі незвычайную знаходку: яны выявілі дзіцяня акулы-прывіду — малавядомага віду рыб, які жыве ў цёмных глыбінях акіяна.

Акул-прывідаў, так званых хімер, вельмі рэдка можна ўбачыць, а сустрэць іх дзіцянят — яшчэ радзей. Толькі што народжаную акулу злавілі на глыбіні каля 1,2 кіламетра недалёка ад вострава Паўднёвы. Па словах удзельніцы каманды навукоўцаў, доктара Брыт Фінучы, гэтае адкрыццё было зроблена выпадкова падчас даследчага тралення падводных папуляцый.

«Глыбаводныя віды, як правіла, цяжка знайсці, і, у прыватнасці, акул-прывідаў — яны звычайна даволі скрытныя. Таму часта мы проста не бачым іх», — распавяла Фінучы.

Эмбрыёны акул-прывідаў развіваюцца ў капсулах-яйках, адкладзеных дарослай асобінай на дне, і сілкуюцца жаўтком, пакуль не будуць гатовыя вылупіцца. Навукоўцы з Нацыянальнага інстытута водных і атмасферных даследаванняў лічаць, што знойдзенае дзіцяня нядаўна вылупілася, бо яго жывот усё яшчэ быў поўны жаўтка. Доктар Фінучы кажа, што юныя акулы-прывіды могуць праяўляць характарыстыкі, адрозныя ад іх дарослых сыродзічаў. Гэта робіць знаходку яшчэ больш важнай.

«Маладыя асобіны могуць жыць у самых розных асяроддзях... у іх можа быць іншы рацыён, яны нават могуць значна адрознівацца ад дарослых. Сустрэча з маладымі асобінамі дапамагае нам лепш зразумець біялогію і некаторыя аспекты экалогіі гэтага віду», — адзначыла вучоная. Даследчыкі маюць намер узяць невялікі ўзор тканкі дзіцяняці хімеры, вывучыць яго генетыку, а таксама іншыя параметры.

Акулы-прывіды — гэта не сапраўдныя акулы, а від рыб — далёкія сваякі акул і скатаў. Яны храстковыя, гэта значыць іх шкілет у асноўным складаецца з храсткоў. Многія акулы-прывіды жывуць на глыбіні, хоць некаторыя віды аддаюць перавагу жыццю на мелкаводдзі ў прыбярэжных водах.

Здароўе на талерцы

АГІДНА, ХОЦЬ ПЛАЧ!

Названы прадукты і напоі, якія выклікаюць парушэнне нюху

Навукоўцы з Універсітэта Рэдынга ў Англіі ў ходзе даследавання высветлілі, што скажэнне нюху можа адбывацца ў сувязі з араматычнымі злучэннямі, якія змяшчаюцца ў такіх напоях, як кава, і такіх прадуктах, як цыбуля, часнок, курыца і зялёны перац. Такая выснова вынікае з даследаванняў, апублікаваных у брытанскім часопісе Communications Medicine.



Адзначаецца, што для правядзення даследавання былі абраныя 29 добраахвотнікаў, у часткі з іх была парасмія (парушэнне нюху). Удзельнікам эксперыменту раздалі розныя склады кававага напою.

Людзі з парасміяй змаглі вызначыць тыя пахі, якія больш за іншыя выклікаюць у іх агіду. Пасля такія ж злучэнні выявілі ў цыбулі, часнаку, курыцы і зялёным перцы.

«Мы знайшлі пераканаўчы доказ таго, што не ўсё адбываецца толькі ў нас «у галаве» і што скажонае ўспрыманне пахаў і звязанае з ім пачуццё агіды могуць быць выкліканы араматычнымі злучэннямі ў некаторых прадуктах», – кажа адзін з аўтараў даследавання доктар Джэйн Паркер.

Яна падкрэсліла, што ў будучыні дазенае даследаванне можа знайсці спосаб палепшыць жыцці людзей, якія пакутуюць ад парасміі.

Тэхналогіі будучыні

«УСІМ АД УСІХ»

Навучыліся мяняць групу крыві для перасадкі донарскіх органаў

Навукоўцы ўніверсітэта ў Таронта распрацавалі і апрабавалі спосаб, які дазваляе на працягу некалькіх гадзін змяняць групу крыві донарскага органа для перасадкі. У перспектыве адкрыццё дазволіць перасаджваць органы па прынцыпе «ўсім ад усіх», гаворыцца ў артыкуле, апублікаваным часопісам Science Translational Medicine.

Навукоўцы адзначаюць, што сёння сумяшчальнасць груп крыві — адзін з галоўных бар'ераў пры перасадцы органаў, паколькі імунная сістэма пачынае атакаваць антыгены непадыходзячай групы.

«Некаторыя пацыенты ў лісце чакання з-за гэтага паміраюць, некаторым даводзіцца чакаць вельмі доўга. Калі мы ліквідуем несумяшчальнасць груп крыві як бар'ер для падбору, мы зробім вялікі крок наперад у справядлівым размеркаванні донарскіх органаў», — распавялі навукоўцы.

Новая тэхналогія прадугледжвае замену другой групы крыві донарскага органа на першую. У артыкуле гаворыцца, што гэтага ўжо дастаткова, каб 80 працэнтаў адабраных для трансплантацыі органаў сталі ўніверсальнымі. Пры першым эксперыменце, падчас якога трансплантаваліся лёгкія, былі выкарыстаны ферменты FpGalNAc-дэацэтылаза і Fp-галактазамінідаза, а затым восем узораў донарскіх органаў ад антыгенаў другой групы. На працягу чатырох гадзін ферменты змаглі знішчыць 97 працэнтаў антыгенаў.

Цяпер канадскія навукоўцы працуюць над стварэннем тэхналогій, якія дазваляюць мяняць на першую трэцюю і чацвёртую групы крыві. Даследчыкі мяркуюць, што спосаб спрацуе з усімі органамі.

Ад пачатку свету

З МОРДАЙ, ЯК У БУЛЬДОГА

Знойдзены астанкі новага віду дыназаўраў

У Егіпце знайшлі скамянелыя рэшткі новага віду драпежных дыназаўраў з сямейства абелізаўрыды з мордай, якая нагадвае сабак пароды бульдог. Аб унікальнай знаходцы піша Daily Mail.

Іншымі асаблівасцямі гэтага віду дыназаўра былі маленькія зубы і вельмі маленькія верхнія канечнасці. Па меркаванні палеантолагаў, драпежнік быў шасці метраў у даўжыню і перамяшчаўся на двух ніжніх трохпальцавых канечнасцях.

Таксама адзначаецца, што знойдзеныя астанкі належалі дыназаўру, які жыў каля 98 мільёнаў гадоў таму. Гэтыя дыназаўры жылі ў крэйдавы перыяд (завяршальны перыяд дамінавання дыназаўраў на Зямлі) на тэрыторыі паўднёвага суперкантынента Гондвана.

Біялогія з анатоміяй

АКНО ДАЎГАЛЕЦЦЯ

Працягласць жыцця чалавека — па сятчатцы вока

Навукоўцы з Аўстралійскага цэнтра вочных даследаванняў (CERA) стварылі саманавучальную камп'ютарную праграму, здольную па сятчатцы вока не толькі вызначыць біялагічны ўзрост чалавека, але і прадказаць, якія праблемы са здароўем ён можа зведаць у будучыні і нават колькі ён пражыве. Алгарытм дае такія дакладныя вынікі, што падчас эксперыментаў дазволіў вылічыць узрост 47 тысяч брытанцаў сярэдняга і пажылога ўзросту з хібнасцю не больш за 3,5 года, паведамляе «Бі-бі-сі».

Хоць раней ужо праводзіліся даследаванні, якія дазволілі выказаць здагадку, што па стане клетак вочнага дна можна рабіць высновы аб пагражальных для чалавека сардэчна-сасудзістых захворваннях, праблемах з ныркамі і іншымі органамі, новае даследаванне ўпершыню ўказала на тое, што па сятчатцы можна меркаваць і аб працягласці жыцця чалавека ў цэлым.

Даследчыкі звязваюць гэта з тым, што тканкі сятчаткі насычаныя крывяноснымі сасудамі і нервовымі канчаткамі, што дае важную візуальную інфармацыю аб стане мозга і сардэчна-сасудзістай сістэмы. Па словах навукоўцаў, сятчатка такім чынам служыць «акном», дзе можна ўбачыць існуючыя і будучыя неўралагічныя праблемы.

«Праведзеная намі работа пацвярджае гіпотэзу аб тым, што сятчатка адыгрывае важную ролю падчас старэння арганізма і вельмі адчувальная да сукупных страт, якія наносіць гэты працэс», — робяць выснову аўтары даследавання.

Хоць навуцы вядомыя і іншыя біямаркёры старэння, яны далёка не такія дакладныя, як вызначэнне ўзросту па сятчатцы, да таго ж вельмі дарагія, забіраюць шмат часу і з'яўляюцца інвазійнымі.

А вось сятчатку можна адсканіраваць менш чым за пяць хвілін, і калі ў ходзе далейшых даследаванняў атрымаецца зрабіць прывязку гэтай тканкавай праслойкі да астатняга арганізма, то ва ўрачоў у руках будзе новы цудоўны дыягнастычны інструмент.

Сяргей СТАРЫНАЎ.
Фота з адкрытых крыніц.

Алена БРАВА

З ЦЫКЛУ «ЖАНЧЫНЫ І ІХ ДЗЕЦІ»

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Проза Алены Брава вымушае павольнага, удумлівага чытання. Менавіта так можна адчуць яе смак — праз дэталі, праз тонкія аўтарскія назіранні. Нарэшце, праз саму рытміку тэкстаў.

Асабліва гэта датычыцца кароткіх апавяданняў пісьменніцы — формы, якая ў нашай прозе часцей за ўсё мае ярка выражаны дакументальны пачатак (гаворка не толькі пра сённяшнюю прозу, але і тую, што пісалася ў дваццатым стагоддзі — Брылём, Сачанкам, Лужаніным, Скрыганом і інш.). Алена Брава ў дадзеным выпадку прапаведуе «чыстае мастацтва», не абцяжараная ўмовай казаць «праўду і толькі праўду». Тым не менш, ёй верыш, суперажываеш разам з яе героямі, уяўляеш іх... І думаеш пра тое, што мастацкі вымысел часам здаецца больш праўдзівым, чым тое, што навязліва папярэджвае цябе: «заснавана на рэальных падзеях».

Алесь БАДАК.

ПЯРСЦЁНАК

Ён, малады, але ўжо вядомы прафесар, запрошаны ў мясцовы ўніверсітэт з лекцыяй, стаяў на вузкай брукаванай вулачцы старога горада. Перад ім былі вітрыны крамаў — раскошна дэкараваныя, багатыя ўсім, што прыдумала чалавецтва для вытанчанасці і задавальненняў. Праваруч была ювелірная — бляск і зіхаценне брыльянтаў, аметыстаў, тапазаў сляпілі вочы, калье і бранзалеты прыгожа абвівалі шыі і рукі манекенаў, буйныя перліны на чорным аксаміце ўражвалі харастом без усялякай штучнасці. Леваруч харчовая лаўка прад'яўляла цуды гастранамічныя: розныя сыры, каўбасы, вяндліну, булкі з румянай скарыначкай, найсвяжэйшую выпечку — круасаны, пірагі, пірожныя, а таксама — шакалад, марскую рыбу, ікру... І шмат такога, чаму ён нават назваў не ведаў. Усё тое, што яму ў дзяцінстве забаранялася есці — абсалютна, цалкам. Да ўніверсітэцкіх год ён не ведаў смаку большай часткі звычайнай чалавечай ежы.

Не, ён не галадаў — маці з усіх сіл старалася, прыдумляючы стравы з садавіны і гародніны. Было пачуццё горычы і неразумення — чаму ён не такі, як усе? Маці тлумачыла, што яго арганізм — асаблівы, бялок для яго — атрута, таму яму нельга тое, што ядуць звычайныя дзеці, інакш яго мозг пачне імкліва дэградаваць, і хутка ён ператворыцца ў ідыёта. Яго інтэлект і псіхіка будуць разбураныя, жорстка казала яна. Гэта немагчыма будзе паправіць, даводзіла, як дарасламу, калі ён плакаў і прасіў хлеба з каўбасой, як у суседскіх дзяцей. А ён усё роўна не разумеў і крыўдзіўся на маці. Нашмат пазней даведаўся, што бываюць такія паломкі ў генах, тады і вырашыў прысвяціць сябе вывучэнню генэтыкі.

Яшчэ ён ведаў, што бацька адразу пасля таго, як маці расказала пра рэдкую невылечную хваробу нованароджанага сына, пакінуў іх. Пра бяссонныя ночы ў бальніцах, дзе яго маці і мацеры такіх жа дзяцей вылічвалі грамы малочнай сумесі, якую можна даць іх немаўлятам, каб не перавысіць дапушчальную норму бялку. Аптэкарскія шалі — першае, што ён памятаў свядомай памяццю. Маці штодня ўзважвае на шалях грамы ежы, вычэрчвае графікі, табліцы. Яна сама ела толькі тое, што можна было яму. Не трымала ў хаце забароненых прадуктаў, каб ён не адчуваў сваёй непаўнавартасці. Яны жылі ў вёсцы — людзі па-рознаму ставіліся да іх няшчасця. І той дзень, калі маці вярнулася дадому ў слязах і шпурнула ў печ просценькі срэбны пярсцёнак з бірузовым каменьчыкам — яна купіла яго, упершыню за гады пасля яго нараджэння вырашыла патраціць штосьці на сябе, на бескарысную рэч, рэч для радасці — а суседка, языкастая баба, адразу заўважыла: «Я ж гаварыла, пенсія інвалідная вунь куды ідзе!» — той дзень ён запомніў таксама.

Яна дабілася свайго, маці. Ніколі больш не выйшла замуж, прысвяціла сябе аптэкарскім шалям, на якіх грам за грамам прырастала ягонае жыццё. Калі яму прыспеў час ісці ў школу, дактары здзівіліся: яго інтэлект быў вышэй сярэдняга. Ён вучыўся, як апантаны. Трымаўся строгай дыеты. Хацеў стаць вучоным-генетыкам, і стаў ім. І зараз, разглядваючы ежу ў вітрыне, узгадаў сваю дзіцячую мару: калі дактары дазволяць яму бялок — а гэта адбудзецца, калі станеш дарослым, абяцала маці, — ён кожны дзень будзе прысвячаць новаму смаку: сёння купіць сыру, заўтра — каўбасы... ікры, шакаладу... і зноў сыру, рознага — сметанковажоўтага, малочна-белага, зеленаватага з плесняй, аранжавага... колькі ў яго будзе адкрыццяў! Ён раскладзе ежу перад сабой на стале і будзе есці прагна, рукамі, забыўшыся на харошыя манеры, якім маці яго таксама навучыла.

Цяпер ён меў дазвол дактароў — і магчымасць купіць усё, што на вітрыне: партманет распіраў важкі ганарар. Але зайшоў у суседнюю краму і купіў пярсцёнак з брыльянтам. І не ведаў, што з ім рабіць, бо маці ўжо некалькі год як ляжала на вясковых могілках.

КАСМЕІ

На клумбе каля хірургічнага корпуса растуць касмеі — кветкі не дзяцінства. Дзяўчаткі бязлітасна абрывалі іх руковыя, белыя, бардовыя прадаўгаватыя пялёсткі, прыклейвалі на свае абгрызеныя пазногці. Уяўлялі сябе касмеямі — касмічнымі феямі, і грэбліва адварочваліся ад дваровай малечы, што абрывала травінкі, гуляючы ў «курачку» і «пеўніка».

Жанчына выходзіць з хірургічнага корпуса якраз пасля таго, як сонца, расштурхаўшы хмары, што ляжалі ўпавалку, распырскала па мокрых суквеццях ліпы свой залаты сок, запаліла ваду ў фантане, пусціла ўроссып зайчыкаў па ваконных шыбах, па траве, прыбітай да зямлі дажджом. Яна думае пра тое, што ўсяго толькі ліпень, яна паспее прагна выпіць лета, а потым будзе павольна цадзіць восень і зіму, як горкія лекі. Не, лекі ёй больш не спатрэбяцца, а восені ды зіме, калісьці нелюбімым, яна навучыцца радавацца. Абавязкова навучыцца. Бо будзе жыць. Будзе жыць!

Яна ідзе па дарожцы бальнічнага гарадка — за тры тыдні ўсё тут вывучана ёю да дробязяў. Ідзе міма мужчыны ў шаўковай бэзавай піжаме; ягоная стомленая, у зморшчынах жонка штодня прыносіць мужу хатнія стравы ў рондалях. Міма адкрытага акна на першым паверсе, за якім штовечар сядзіць мужчына ў інвалідным вазку з шафранавым колерам твару і пластырам на ключыцы. Шафранавы мужчына ніколі не мяняе паставы.

Тая, якую сёння выпісалі, нічога не ела з ранку. Яна становіцца ў чаргу да палаткі, дзе прадаюць прысмакі і садавіну. Разглядваючы ежу, бакавым зрокам заўважае дзве кульці, абцягнутыя яркаружовай навюткай скуркай. На адной з гэтых былых рук захаваўся вялікі палец, і зараз гэты адзіны палец прыціскае да другой, бяспалай кульці румяны жоўты яблык. Павольна, баючыся ўбачыць нешта жахлівае, яна паварочвае галаву. Пакалечаная, у шлёпанцах і халаце, расплочваецца: прадаўшчыца звыкла вывуджвае манеты з яе кашалька.

Жанчына скаланаецца. Ёй ужо не хочацца есці, не хочацца нічога купляць тут. Выбіраецца з чаргі і натыкаецца на позірк шафранавага мужчыны з пластырам. З адкрытага акна той з непрыхаванай зайздрасцю назірае за калекай, якая, спрытна прыціскаючы кульцямі яблык да грудзей, ідзе па дарожцы ў корпус. Падыходзіць санітарка, бязногага перакладаюць на ложак, санітарка зачыняе акно: пасля дажджу прахалодна.

Касмеі адчужана глядзяць у неба. Амытыя дажджом пялёсткі нагадваюць доўгія лакавыя пазногці. На некаторых па зіхоткай кроплі. Сучасныя дзяўчаты сказалі б: манікюр са стразамі.

КАШАЛЁК

Жэня ў дзяцінстве не мела кашалька — у гэтым уся справа. Калі б ён у яе быў, дык і вершы яна, можа, пісала б зусім іншыя, і падабаліся б яны ўсім без выключэння. Ну або амаль усім.

Бацькі Жэні развяліся, калі ёй было сем гадоў. Бацьку яна любіла так, што ў горле перасыхала, калі глядзела на яго фатаграфію. Маці забараняла ёй не толькі бачыцца з бацькам, але нават узгадваць пра яго. Вядома, тэлефанаваць бацьку таксама забаранялася. Таму Жэня тэлефанавала яму з аўтамата на рагу, а для гэтага збірала двухкапеечныя манеткі.

Маці давала ёй у школу дзесяць капеек — на булачку і шклянку чаю. Жэня купляла піражок з павідлам за пяць капеек, а чай не купляла зусім, запівала прыкрую саладосць вадой з-пад крана. Так за два дні ў яе набіралася пяць «жоўценькіх».

Зашклёная будка з рыпучымі дзвярыма — замест пабітага шкла праваруч устаўлена фанера. Жэні даводзіцца ўстаць на дыбачкі, каб дацягнуцца да праразі на апараце. Зняць трубку, падобную да абвугленай косткі вялізнай жывёліны. Чуюцца гудкі, бразгат — гэта правалілася ў жалезнае чэрава нагрэтая ў яе далоні манетка. Бацькі няма ў кабінеце. «Што перадаць?» — пытаецца ягоны калега. Жэня моўчкі вешае трубку.

Часам стары апарат, праглынуўшы грошы, глуха маўчыць. У трубцы пануе мёртвая касмічная ноч — ні гудка, ані шолаху. Чорная прорва зжэрла надзею Жэні пачуць: «Прывітанне, дачка». Другая спроба. Манетка падае і працягвае ляцець у пустэчу — бясконцую, бяздонную. Бязгорную. Колькі такіх жоўценькіх медных сонцаў, запушчаных Жэняй, носіцца па зямной арбіце? Засмучаная Жэня выходзіць на ўтаптаны пясок каля будкі, дзе чакае дзяўчынка з другога пад'езда. Яны саўдзельніцы, тое дзяўчо таксама тэлефануе свайму бацьку з аўтамата, праўда, з іншай прычыны: у іхняй кватэры няма тэлефона. Абедзве прагна мараць пра сустрэчу са сваімі бацькамі, але дарма. Бацькі далёка ад іх, а насамрэч — праз пару вуліц, гарадок жа маленькі. У іншых сем'ях, як на іншых планетах. Адзіны спосаб сувязі з імі — праз рубку касмічнага карабля, у якую ператвараецца будка тэлефона-аўтамата, калі тая ці іншая дзяўчынка, нагружаная безнадзейнай любоўю і пяшчотай, уваходзіць сюды.

Дзяўчынку з другога пад'езда завуць Галінкай. Яна старэйшая за Жэню і водзіцца з дрэннымі кампаніямі. Неяк увечары Жэня бачыла яе за гаражамі з Воўкам Кулінчыкам па мянушцы Куля: Воўка вучыў Галінку піць віно з рыльца бутэлькі. Чым маглі скончыцца такія вячоркі, Жэня ўжо ведала: з адной дзяўчынкай з іх школы, што ва-дзілася з дарослымі хлопцамі, здарылася бяда. Дакладней — БЯДА, менавіта так гэтае слова прамаўлялі настаўніцы, з жахам і шкадаваннем. Дзяўчынка потым змяніла школу. Непакоячыся пра яе і пра Галінку, Жэня і напісала той верш. Аб уяўнай дзяўчынцы, з якой здарылася бяда — там, за гаражамі. Дзе потым увесь дзень валяўся кашалёк, набіты двухкапеечнымі манетамі. Жэня бачыла ў Галінкі такі кашалёк з чырвонага дэрмаціну.

Сама Жэня кашалька не заводзіла. Калі б ён трапіўся на вочы маці, тая адразу ўсё зразумела б. Манеткі Жэня хавала ў розных месцах кватэры і нават дасягнула ў гэтай справе пэўнай віртуознасці, але тут бацька пераехаў, а ў іншы горад з аўтамата не пазвоніш.

Верш Жэня пасля доўгіх ваганняў паказала паэту — быў такі ў іх горадзе, кіраваў літаратурным аб'яднаннем пры раённай газеце. Паэт пераймаў Роберта Раждзественскага, валасы зачэсваў назад, гаварыў глухавата і злёгку нараспеў. Ён прачытаў верш, памаўчаў, сказаў, калі прыйсці: быў дужа занятым чалавекам. Праз тыдзень працягнуў Жэні ліст паперы, на ім было нешта надрукавана роўнымі слупкамі. Яна не адразу пазнала свой верш. Словы, якія звінелі званочкамі, зрабіліся нібы з дроту. Гераіня таксама змянілася: замест таго, каб без нагоды тэлефанаваць, назаляць занятаму чалавеку, яна купіла на ўсе свае назапашаныя двухкапеечныя манеты латарэйны білет і выйграла аўтамабіль «Жыгулі», але ўзяла грашыма. Гэта быў выдатны фінал — верагодна, праекцыя летуценняў самога паэта, Жэня ад душы жадала Галінцы такой цудоўнай біяграфіі. Але гэта быў не яе верш.

А манеткі, схаваныя Жэняй, трапляліся ёй у кватэры яшчэ доўга. Нават калі знікла краіна, якая іх чаканіла, Жэня працягвала вытрасаць жоўтую медзь з кішэняў сваёй дзіцячай вопраткі, якую перашывала для дачкі, вывуджваць з парцалянавага чайніка мамінага параднага сервіза, прызначанага на продаж. За партрэтам Караткевіча на кніжнай паліцы знайшоўся цэлы мурашнік «жоўценькіх». Валюта неіснуючай дзяржавы выяўлялася за падкладкай яе школьнага партфеля, у скрынях пісьмовага стала і шкатулках з упрыгожваннямі, цьмяна паблісквала на дне бляшанкі для нітак ды іголак. Гэтыя знаходкі кожны раз нагадвалі Жэні пра надрукаваны на машынцы правільным слупком чужы верш, і яна адкладала прыборку або шыццё, і перачытвала тое, што цяпер запісвала на бягу — то на рэцэпце з дачынай мікстурай, то на квітках з пральні. І пыталася ў сябе: а гэтыя вершы — мае? Сапраўдныя?

У той дзень, калі ў Жэні выйшаў першы зборнік вершаў, жоўтая манетка выпала з-за абажура настольнай лямпы — дачка стала студэнткай, Жэня зібрала ёй рэчы ў інтэрнат. Вершы спадабаліся не ўсім, некаторыя знайшлі іх сумнымі, а людзям часта хочацца чытаць пра вясёлае, напрыклад, як хтосьці выйграў у латарэю аўтамабіль «Жыгулі».

Дарэчы, верш пра дзяўчынку, з якой за гаражамі здарылася няшчасце, у зборнік не ўвайшоў. У тэксце была адна дэталь, якую Жэня палічыла непраўдзівай, а перапісваць не захацела. Ну не мог у часы ее дваровага дзяцінства кашалёк з грашыма цэлы дзень праляжаць на зямлі. Тым больш — чырвоны. Не мог! А ў літаратуры ж усё павінна быць як у жыцці, хіба не так?

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении смешанных электронных торгов

Оператор электронной торговой площадки:
коммунальное консалтинговое унитарное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации», местонахождения:
г. Минск, ул. Чкалова 5, каб. 321.
Электронный адрес электронной торговой площадки: www.torgi.rlt.by.
Дата проведения смешанных электронных торгов: 9 августа 2022 г.

Единый предмет смешанных электронных торгов:
недвижимое имущество, находящееся в собственности Минского района, и право заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для его обслуживания (организатор электронных торгов: комитет «Минскоблимущество», г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел.: (8017) 500 47 49; 500 47 10; 516 80 55;
недвижимое имущество, находящееся в собственности общества с ограниченной ответственностью «Торговый дом «ЖДАНОВИЧИ» (далее – ООО «Торговый дом «Ждановичи») и иное имущество (организатор электронных торгов: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел. (8017) 516-80-61**;**
